Пасля грамадзянскай вайны Ксенафонт Марціновіч назначаецца начальнікам ваенна-марской інспекцыі Наркамата рабоча-сялянскай інспекцыі краіны. З 1937 г. ён начальнік Першага галоўнага ўпраўлення Наркамата абароннай прамысловасці СССР.

Працуючы ў Маскве на адказнай дзяржаўнай пасадзе, К. П. Марціновіч меў шырокія сувязі з культурным, у тым ліку пісьменніцкім асяроддзем краіны. Асабліва дарагімі і незабыўнымі былі для яго сустрэчы з А. М. Горкім.

Высокі быў яго аўтарытэт у армейскіх колах і ва ўрадзе. У 1930 г. быў зацверджаны статут новага баявога ордэна Чырвонай Зоркі. Пастановай Прэзідыума УЦВК СССР 23 мая 1930 г. К. П. Марціновіч быў узнагароджаны ордэнам пад № 2.

А праз некаторы час у Чырвонай Арміі раскруцілася страшэннае кола палітычных рэпрэсій, якое захапіла і загубіла разам з тысячамі вядомых военачальнікаў і К. П. Марціновіча...

*М. Капач*

**АД МАЗЫРСКАГА САВЕТА СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ**

Браты-сяляне! Уступаючы ў 1918 год, Мазырскі павятовы Савет сялянскіх дэпутатаў звяртаецца да вас з брацкім заклікам згуртавацца ў адну агульную дружную і стойкую арганізаваную сілу для прывядзення ў парадак разбуранага гаспадарчага апарата і адміністрацыйна-судовага ўпраўлення.

Новая земская ўправа ўжо адкрыла сваю дзейнасць. Цяжка ёй будзе справіцца і наладзіць разбураны фінансавы механізм. Але, мяркуючы па яднанню на сялянскім з'ездзе, мы разлічваем на шырокую і дружную падтрымку ўсіх сялян.

Мы верым у сілу рускага чалавека, у яго творчы розум і таму галосна скажам: мы перажылі стагоддзі прыгнёту царызму, перажывем і гэты час, канчаткова замацаваўшы за сабою волю, зямлю і брацтва народаў.

*Азараў*
Старшыня Савета, член Усерасійскага выканаўчага камітэта Саветаў

*«Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов», 5 лютага 1918 г.*

## Адпор інтэрвентам

Пасля свайго першага ўсталявання Савецкая ўлада трымалася ў Мазыры нядоўга. 8 лютага 1918 г., парушыўшы пагадненне аб перамір'і, Германія накіравала свае войскі на ўсход. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне толькі што створанай Чырвонай Арміі, немцы захапілі Мінск, Гомель, акупіравалі большую частку Беларусі. У пачатку сакавіка варожыя войскі ўзялі пад кантроль Мазыр і Мазырскі павет. Гэтая тэрыторыя ўвайшла ў склад «Палескай губерні», якая падпарадкоўвалася гетману Украіны Скарападскаму. За нямецкімі войскамі ў Мазыр прыйшло падраздзяленне гайдамакаў, пачала дзейнічаць іхняя «варта». Скарападскага хутка знялі з пасады, і гэтыя сілы сталі падпарадкоўвацца «галоўнаму атаману» Пятлюру.

На тэрыторыі, акупіраванай немцамі, было ўведзена ваеннае становішча. Жыхарам пасля 20 гадзін забаранялася выходзіць з дому, вокны яны павінны былі завешваць або закрываць аканіцамі. Усе газеты канфіскоўваліся, за выдачу палітычных агітатараў абяцалася ўзнагарода — 200 рублёў.

У свае маёнткі вярнуліся многія памешчыкі. Мясцовая ўлада ўвяла ўсемагчымыя грашовыя і натуральныя падаткі, у тым ліку пастаўкі буйной рагатай жывёлы, коней, авечак, свіней, курэй, збожжа. Усё вывозілася ў Герма-

нію. Нямецкая камендатура, «варта» і «дзяржаўная паліцыя» тэрарызавалі насельніцтва горада і вёсак.

Бальшавіцкая арганізацыя, ядром якой стала ячэйка на фабрыцы «Маланка», пайшла ў падполле. Яна падтрымлівала сувязь з бабруйскай падпольнай арганізацыяй і партыйным цэнтрам у Смаленску. У рабоце арганізацыі прымалі актыўны ўдзел М. А. Галадзец, С. Н. Дуброва, С. В. Федаровіч, Ф. І. Віршыц і іншыя.

Падпольшчыкі вырашылі адзначыць свята 1 Мая. Нямецкае камандаванне выдала загад аб забароне мітынгаў і дэманстрацый, але падрыхтоўка да свята працягвалася. Распаўсюджваліся лістоўкі не толькі сярод рабочых, але і сярод нямецкіх салдат.

Арганізатары дэманстрацыі Віршыц, Траццякоў, Гафштэйн, В. Чарнецкі, Зэльдзін, Кірпічнікаў і Ліўшыц сабраліся каля фабрыкі «Маланка». З чырвоным сцягам, які нёс Фёдар Віршыц, дэманстранты накіраваліся да цэнтра горада. З раёна Целяпуноў ішла група рабочых фабрыкі «Прыма», да іх далучылася яшчэ адна вялікая група рабочых — усяго больш як 300 чалавек. Нягледзячы на папярэднюю забарону, камендант вымушаны быў дазволіць дэманстрантам выйсці на цэнтральную плошчу, дзе адбыўся мітынг.

Вясной і летам падпольная работа актывізавалася. Заходні абкам РКП(б) накіраваў у Мазыр сваіх актывістаў. Па горадзе распаўсюджвалася ўсё больш лістовак, у тым ліку і на нямецкай мове. Нарастаў і партызанскі рух, неабходна была зброя. Падпольшчыкі Траццякоў, Аркін, Сухарэнка, Бекерман устанавілі сувязь з аховай склада ў Пхове і здолелі здабыць зброю для партызан. Значная колькасць гэтага ўзбраення была сапсаваная, але яго адрамантавалі. Партызанскія атрады нападалі на падраздзяленні акупантаў, захоплівалі зброю, боепрыпасы. Невялікі атрад Андрэя Зубца ўварваўся ў горад Мазыр, вызваліў з турмы групу палітычных зняволеных.

У жніўні адбылася нарада кіраўнікоў падпольных бальшавіцкіх арганізацый Гомельскага, Мазырскага і Рэчыцкага паветаў, арганізаваная Палескім камітэтам партыі. Было вырашана пачаць падрыхтоўку паўстання, але бальшавікі папярэджвалі аб небяспецы дачаснага выступлення.

У лістападзе 1918 г. у Германіі адбылася рэвалюцыя, ліквідавана манархія. Урад РСФСР скасаваў грабежніцкі Брэсцкі мір. Пачалося выгнанне акупантаў з гвалтоўна захопленай тэрыторыі. Падпольшчыкі ўзмацнілі агітацыйную работу сярод салдат нямецкага гарнізона. У аглядзе інфармацыйнага аддзела Белнацкама гаварылася: «Германскія салдаты ў Беларусі канчаткова дэмаралізаваны. Па сваім знешнім выглядзе яны нагадваюць салдат часоў керанпічыны. Спекулююць на вуліцах тытунём, хлебам, часта нападаюць на афіцэраў. Непадпарадкаванне начальству — не рэдкасць...»

Але ў 386-м пяхотным палку 20-й нямецкай дывізіі, які стаяў у Мазыры, быў поўны парадак. У горадзе размяшчалася яшчэ дружына пятлюраўцаў — звыш 500 чалавек і белагвардзейскі атрад палкоўніка Каменева.

Восенню актывізаваўся партызанскі рух. З дапамогай разведчыкаў 151-га палка партызанамі быў разбіты буйны нямецкі атрад у вёсцы Дудзічы (цяпер Калінкавіцкі раён), партызаны часта нападалі і на нямецкія эшалоны на ст. Калінкавічы.

У вёску Слабада былі прысланы ўпаўнаважаны ЦК бальшавікоў матрос Сядых, бальшавік Раташняк і палітработнік Палахоўскі. Іх мэтай была арганізацыя атрада з мясцовых жыхароў для барацьбы з контррэвалюцыяй і інтэрвенцыяй. Патрабаваліся сродкі і адданыя справе рэвалюцыі людзі. Такім быў былы франтавік І. Д. Ганчар. Яму было даручана дабрацца да штаба Заходняга фронту, які знаходзіўся за Жлобінам. Там ён атрымаў зброю і грошы, неабходныя інструкцыі. 4 лістапада Ганчар вярнуўся і арганізаваў пар-



Я. Я. Шкарадэк — жыхар Мазыра, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны



Д. З. Мануільскі

тызанскі атрад, які актыўна ўключыўся ў барацьбу з ворагам.

Жыхары вёсак Слабада, Майсееўка, Лешня, Скрыгалаў стварылі два партызанскія атрады. Адзін узначаліў І. Д. Ганчар, другі — Кавалёў. Актыўна змагаліся супраць захопнікаў партызаны Д. І. Клімчанка, Ц. Б. Гнедзька, М. І. Паўлаў, П. С. Рухло і іншыя. Цёмнай восеньскай ноччу была праведзена смелая аперацыя супраць гайдамакаў. Праз некаторы час партызаны напалі на акупантаў у вёсках Слабада і Скрыгалаў і вызвалілі іх.

У лясах вакол вёсак Мялешкавічы, Махнавічы, Буйнавічы жах на акупантаў наводзіў атрад пад кіраўніцтвам К. Качэні. Паспяхова дзейнічаў таксама атрад М. А. Лук'яновіча, які ўваходзіў у першы склад Мазырскага рэўкама. Увосень 1918 г. у партызанскіх атрадах павета змагалася больш як тысяча чалавек.

Рэвалюцыя ў Германіі, партызанскі рух на тэрыторыі павета, актыўныя дзеянні Чырвонай Арміі прымусілі нямецкае камандаванне пайсці на перагаворы з прадстаўнікамі Чырвонай Арміі. Перагаворы ішлі цяжка, але ў выніку нямецкае камандаванне вымушана было прапусціць у Мазыр 6 чалавек для арганізацыі Савецкай улады.

18 снежня 1918 г. атрады Чырвонай Арміі падышлі да Мазыра. У зводцы палітаддзела Заходняга фронту гаварылася: «Нашы войскі былі сустрэты за дзве вярсты ад горада рабочымі з музыкай і песняй «Інтэрнацыянал». Арганізаваны рэўкам...» Нямецкія салдаты не супраціўляліся. Белагвардзейскі атрад Каменева ў колькасці 300 чалавек быў раззброены, з турмы вызвалены палітычныя зняволеныя. На гарадскім мітынгу выступалі чырвонаармейцы, рабочыя, а таксама нямецкія салдаты. У склад рэўкама ўвайшлі бацька і сын Лобачы, Манахаў, Серабракоў і іншыя.

У горадзе ў той неспакойны час адначасова знаходзіліся нямецкія войскі і падраздзяленні Чырвонай Арміі. Нямецкае камандаванне патрабавала вывесці з Мазыра і Калінкавіч чырвонаармейцаў, з Германіі прыйшло падмацаванне. 21 снежня ў горад прыбылі прадстаўнікі Савецкага ўрада Д. З. Мануільскі, В. Р. Мянжынскі, Д. Гурэвіч. У выніку перагавораў прыйшлося вывесці батальён чырвонаармейцаў. Пры непасрэднай дапамозе нямецкага камандавання ў горад прыйшоў вялікі атрад пятлюраўцаў, улада перайшла ў рукі пятлюраўскай дырэкторыі. Рэўкаму прыйшлося ісці ў падполле. Пачалі стварацца ўзброеныя атрады рабочых.

Зноў актывізаваліся баявыя дзеянні партызан, на гэты раз супраць пятлюраўцаў. У раёне Мазыра дзейнічала вялікая колькасць розных атрадаў. У пачатку студзеня 1919 г. у горад прыбыла воінская група, якая называла сябе ўкраінскім рэспубліканскім атрадам. Начальнік атрада Семяненка аб'явіў, што яго атрад «стаіць на ахове заваёў рэвалюцыі, але падтрымлівае ўладу дырэкторыі». Гэта выклікала пратэсты мазыран. 8 студзеня атрад па патрабаванні рабочых вымушаны быў пакінуць горад. А праз тры дні ў горад уступіў 6-ты Гродзенскі стралковы полк і бронеатрад Чырвонай Арміі. У Мазыры аднавілася Савецкая ўлада.

*Я. Фарбераў*

## З РАСПАРАДЖЭННЯ МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕНРЭЎКАМА АБ НАРЫХТОЎЦЫ ЛАПЦЕЙ ДЛЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

*27 верасня 1918 г.*

**Валасным рэўкамам Мазырскага павета**

На падставе тэлеграмы старшыні Белрэўкама прапануецца валасным рэўкамам прыняць усе меры да аказання садзейнічання і дапамогі агентам Цэнтрабелсаюза, якім даручана нарыхтаваць 200 тысяч пар лапцей для Чырвонай Арміі...

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 30. Воп. 1. Л. 9.*

## З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА ШТАБА ЗАХОДНЯЙ АРМІІ

*19 снежня 1918 г.* Смаленск

Комиссар коменданта станции Жлобин Фоменко доносит, что им сегодня, в 3 часа, получено по прямому проводу из Гомеля от т. Мануильского следующее: «Состоялось соглашение с дивизионным Мозырским Советом, в силу которого линия Калинковичи — Мозырь — Лунинец занимается 17 декабря нашими войсками; германские войска остаются до тех пор, пока не получат возможность выехать. Вся власть передается Совдепам и ревкомам...

Наштармзап *Новиков*
Военком *Белевский*

*Расійскі дзяржаўны ваенны архіў (РДВА). Ф. 6. Воп. 4. Спр. 36. Л. 104—105.*

## ТЭЛЕГРАМА ПАЛІТАДДЗЕЛА ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ Я. М. СВЯРДЛОВУ

*19 снежня 1918 г.*

14 снежня камандзір 151-га палка быў у Мазыры на перагаворах з германскім дывізійным саветам. Абмяркоўвалася пытанне заняцця савецкімі войскамі Мазыра і аб сумеснай рабоце з немцамі, прычым было ўказана, што недапушчэнне ў горад выкліча паўстанне з чыгуначнай забастоўкай, што можа перашкодзіць сумеснай рабоце і эвакуацыі... Заява зрабіла ўплыў, і 16 снежня быў скліканы з'езд Саветаў раёнаў Рэчыца — Пінск. Звесткі аб рашэнні з'езда пакуль яшчэ не атрыманы.

Пасяджэнне ахоўвалася ротай нямецкіх салдат на выпадак непаразумення з боку «дзяржаўнай варты». Пасля сканчэння пасяджэння дэлегатаў праводзілі за горад каравул і члены Савета...

Заг. палітаддзела

*РДВА. Ф. 6. Воп. 4. Спр. 36. Л. 102.*

## З ПАВЕДАМЛЕННЯ АБ ВЫЗВАЛЕННІ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА І АДНАЎЛЕННІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ПАВЕЦЕ

*21 снежня 1918 г.*

18 декабря войска Красной Армии заняли Мозырь Минской губ. Войска были восторженно встречены рабочими и крестьянами. Весь Мозырский у. и прилегающие к нему уезды охвачены восстаниями, которые идут под лозунгом объединения с Советской Россией и явно против Петлюры и его компании. Во многих деревнях, селах Мозырского и других уездов образовались Советы депутатов. На улицах происходит братанье красноармейцев с немцами-солдатами. Наши красноармейцы остались без значков, так как эти значки отбирают у них немцы и прикрепляют их к своим фуражкам. Были митинги, выступали местные товарищи и немецкие солдаты. Сегодня освобождено 30 человек политических. На митинге принята резолюция и приветствие вождю всемирного пролетариата товарищу Ленину.

*Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. 393. Воп. 4. Спр. 59. Л. 68.*

## ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ СТАНОВІШЧЫ Ў МАЗЫРЫ

*Пачатак студзеня 1919 г.*

Из Гомеля в Мозырь полулегально прибыл уполномоченный по восстановлению Революционных органов власти в Белорусском и Украинском Полесье Е. Я. Молотов-Таращанский, имевший на это мандат от Д. З. Мануильского. В острой борьбе партий эсеров, большевиков и союза Бунд был организован Военно-революционный комитет еще до оставления немцами Мозыря. Одновременно контрреволюционные силы и сторонники Петлюры сорганизовали свою власть в виде некоей Директории, пользующейся покровительством немецкого оккупационного командования. А когда ревком окончательно утвердился в Мозыре в качестве единственной власти, контрреволюционеры в ночь на 1.01.1919 г. пытались силой оружия совершить переворот, но были разгромлены рабочими отрядами.

*Рукапісны фонд Гомельскага абласнога музея. Трудящиеся Гомельщины в борьбе за власть Советов (1917—1920). Хроника событий. Гомель, 1958. С. 130.*

## З ДАНЯСЕННЯ НАЧАЛЬНІКА АПЕРАТЫЎНАГА АДДЗЕЛА ЗАХОДНЯЙ АРМІІ

*14 студзеня 1919 г.* № 116/0 г. Смоленск *6 час. 0 мін.*

...Мозырское направление. 12 января частями Гродненского полка и броневым отрядом занят Мозырь, части 153-го полка — в районе Калинковичи — Горочичи...

Начоперотдела генштаба *В. В. Сергеев*

*РДВА. Ф. 6. Воп. 4. Спр. 36. Л. 241.*

## ТЭЛЕГРАМА
**мінскага губернскага ваеннага камісара Някрасава**

*9 лютага 1919 г.*

Срочно военная, Москва, Совнарком, ВЦИК, Свердлову,
Склянскому, Цека коммунистов большевиков.
Копия: Минск, правительству Белорусской республики Мясникову

В Речицком, Мозырском, Пинском уездах Минской губернии Советская власть организована. Причем организовавшийся в конце декабря восемнадцатого года Полесский ревком, состоящий целиком почти из левых эсеров, проводил политику организации Советской власти с левоэсеровскими взглядами, доходя до того, что для партии коммунистов (оставляли) два или одно место.

Губвоенком *Некрасов*

*Переписка секретариата ЦК РКП(б) с местными партийными организациями (январь — март 1919 г.). Сборник документов. М., 1971.*

## Выгнанне пятлюраўцаў

У складзе Мінскай губерні Мазыр і павет увайшлі ў склад БССР. Пачалося аднаўленне народнай гаспадаркі. Для кіраўніцтва гаспадарчай дзейнасцю быў створаны Савет народнай гаспадаркі ў складзе вытворчага, транспартнага і лясного аддзелаў. Рыхтаваліся аднавіць работу прамысловыя прадпрыемствы, у першую чаргу запалкавая фабрыка «Маланка». Адкрыта была майстэрня па рамонце абмундзіравання. Дала электрычнасць адрамантаваная электрастанцыя. Найбольш складана было аднавіць вядучую галіну прамысловасці — лясную. Адсутнасць сродкаў не дазваляла наладзіць работу лесапільняў, фанерных прадпрыемстваў, смалакурняў. Да вясны 1919 г. у павеце было ўтворана 18 саўгасаў, сярод іх і саўгас «Слабада». Народ імкнуўся да мірнай, стваральнай працы. Але ішла грамадзянская вайна.

Напярэдадні вясны 1919 г. у Мазырскім павеце было неспакойна і трывожна. 26 сакавіка павятовы камітэт партыі тэлеграфаваў ЦК РКП(б): «Положение в Мозыре критическое, отсутствуют военные силы на участке фронта Мозырь — Овруч... Необходимо прислать надежные рабочие полки и красных офицеров...»

Былы афіцэр царскай арміі эсэр М. А. Стракапытаў арганізаваў мяцеж у Гомелі. Яго падтрымаў 68-мы полк 8-й стралковай дывізіі, які самавольна пакінуў фронт у раёне Мазыра. А 30 сакавіка Мазыр занялі пятлюраўцы. Абарону на левым беразе Прыпяці трымалі мясцовыя актывісты і рэшткі сіл Чырвонай Арміі, якія заставаліся тут. Тым часам на чыгуначным раз'ездзе Галявіцы, што знаходзіўся недалёка ад горада, супраць стракапытаўскіх мяцежнікаў дзейнічалі браняпоезд, якім камандаваў ваенкам Смаленскай губерні І. А. Адамовіч (будучы старшыня Саўнаркама БССР), і часці восьмай стралковай дывізіі. Разграміўшы сілы мяцежнікаў, браняпоезд і чырвонаармейцы ўзялі напрамак на вызваленне Мазыра.

Дзесяць дзён пятлюраўцы гаспадарылі ў горадзе. Гэта былі страшныя дні. Грабяжы, забойствы, расправы над мірным насельніцтвам... Гарэлі дамы. Пятлюраўцы проста на вуліцы адбіралі ў людзей кашалькі з грашыма, каштоўныя рэчы, здымалі абутак, вопратку... А пры адступленні забралі сілком з сабой 400 юнакоў.

Лёс многіх кіраўнікоў горада і павета быў трагічны. Старшыня рэўкама М. А. Галадзец, члены рэўкама А. Родзік і Сакалоў, камуністы Гольдэнберг, Ямпольскі не паспелі эвакуіравацца і некалькі дзён хаваліся ў горадзе. З дапамогай верных людзей дабраліся да вёскі Касцюковічы, дзе сыны мясцовага старасты пераправілі іх на левы бераг Прыпяці. Там яны далучыліся да Мазырскага жалезнага камуністычнага атрада.

На досвітку 10 красавіка, пад націскам Чырвонай Арміі, пятлюраўцы сталі пакідаць Мазыр. Асобныя роты 66-га палка і атрад мазырскіх камунараў на чале з М. А. Галадцом на параходах «Тураў» і «Сокал» пераправіліся цераз Прыпяць і авалодалі горадам. Потым, уварваўшыся на станцыю Козенкі, захапілі браняпоезд ворага, 29 вагонаў і платформу са снарадамі. Не абышлося без страт. Каля Міхалак загінуў камсамолец Палей.

З вялікай радасцю сустрэла насельніцтва Мазыршчыны сваіх вызваліцеляў. 11 красавіка на партыйным сходзе камуністаў 66-га палка і партыйцаў штаба гарнізона горада быў створаны Мазырскі рэвалюцыйны камітэт у складзе старшыні М. Галадца і членаў Розіна і Сакалова.

Значная роля ва ўмацаванні Савецкай улады на вёсцы была адведзена камітэтам беднаты. Камбеды, якія ўзніклі на вёсцы пасля выгнання пятлюраўцаў, дапамаглі бядняцкім гаспадаркам у правядзенні палявых работ, надзяленні іх зямлёй. Так, у вёсцы Бабры кіраўніком камітэта стаў Я. М. Бобр (ён потым ваяваў у складзе Мазырскага стралковага палка), членамі камітэта сталі Антон і Раман Бабры, Скідан. Камбеды былі створаны ў валасных цэнтрах — Мялешкавічы, Міхалкі, Слабада, Скрыгалаў, а таксама ў вёсках Барбароў, Махнавічы, Бібікі, Бокаў і іншых.

На Прыпяці пачала ствараецца рачная ваенная флатылія з параходаў «Сокал», «Чацвёрты», «Ржышчаў», «Пакорны». З дна ракі быў падняты затоплены 10 красавіка пры перавозцы войск параход «Тураў». У Пхове знаходзілася многа паўбраніраваных маторных катэраў і дапаможных суднаў, якія былі ўключаны ў склад флатыліі. Камандзірам флатыліі быў прызначаны прыпяцкі рачнік Леанід Асоўскі.

Чырвонаармейцы і жыхары Мазыра за 20 дзён адрамантавалі ўзарваныя чыгуначныя і пешаходныя масты цераз Прыпяць. Аднаўляліся прамысловыя прадпрыемствы.

*І. Краўцоў, Я. Фарбераў*

**ТЭЛЕГРАМА № 628**
**камандзіра камуністычнага атрада М. Галадца (Заходні фронт)**

*8 красавіка 1919 г.*

Москва, Центральному комитету партии коммунистов

5 апреля вырвался из Мозыря, занятого петлюровцами 29 марта. (Мозырь) абсолютно разгромлен. Имеется много жертв в окрестностях Мозыря. Трупы изуродованных мозырян, убитые женщины, коммунисты, (идут) гонения на рабочих и коммунистов. За мою голову обещано 100 000 рублей. Из моего коммунистического отряда имеются убитые, раненые и растерзанные. Оставшиеся в живых коммунисты отряда ежедневно вырываются из Мозыря в Калинковичи и дают хорошие сведения. Приступили к дополнительной вербовке коммунистического отряда из оставшихся в живых рабочих. Роты (завтра) или послезавтра выступают на фронт.

Командир коммунистического отряда *Голодец*

*Расійскі цэнтр захавання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі (РЦЗВДНГ). Ф. 17. Воп. 65. Спр. 152. Л. 54.*

**ТЭЛЕГРАМА старшыні ваенна-рэвалюцыйнага камітэта г. Мазыра**

Москва, ЦК коммунистов *13 красавіка 1919 г.*

10 (апреля) Мозырь занят красными войсками 66-го полка и железным коммунистическим отрядом... Красный Мозырь ...окончательно разгромлен петлюровскими бандитами и присоединившимися к ним кулакам, черносотенцами, белогвардейцами, гимназистами, реалистами и прочими сынками, ушедшими с ними... 11 (апреля) на партийном совещании с участием коммунистов полковых ячеек и коммунистов штаба гарнизона был сконструирован Военно-революционный комитет. 13 (апреля) были довыборы членов Военно-революционного комитета. Избраны: Хоботов, Ковенцев, Богданович и Певзнер. ...

Председатель Военно-революционного комитета *Голодец*

*РЦЗВДНГ. Ф. 17. Воп. 65. Спр. 26. Л. 30.*

**ТЭЛЕГРАМА ўпаўнаважанага ЦК РКП(б) і УЦВК па Смаленскай і Мінскай губернях К. І. Ландара**

*27 мая 1919 г.*

З адреса: Москва, Цека РКП, Маховая, 7, ВЦИК, Кремль, Совнарком, Ленину.

Последний крупный отряд бандитов, оперировавший в Мозырском уезде, ликвидирован. Предводитель банды Шиманский захвачен в Ельской волости. Бандиты рассеяны. Партийная работа в уезде отсутствует. В Мозыре зарегистрировано 24 коммуниста и 15 сочувствующих. В 24 волостях всего 6 ячеек. Советская работа после петлюровской оккупации начинает налаживаться. Настроение крестьян в пользу Советской власти. Батраки не организованы. В волостных исполкомах бедняки отказываются работать, не получая денег. Денежный кризис здесь невероятен, парализует всю советскую работу. По заготовке дров задолжали крестьянам 6 миллионов (рублей). Рабочие и служащие не получают денег, некоторые с января. Могут приостановиться начатые работы по ремонту моста через Припять из-за отсутствия денег. Погибают заготовленные бревна, доски, фанера, дрова на десятки миллионов рублей. Начались лесные пожары. Главлеском Литвы и Белоруссии проявил преступную бездеятельность в отношении Мозырского района. Крестьяне относятся благожелательно. Объявлена мобилизация за 5 лет Советом Обороны Литвы и Белоруссии. Добровольная крестьянская (мобилизация) потерпела неудачу. Крестьяне согласны идти принудительно или по жребию. Коммунисты дали 30 человек. Профессиональные союзы дали 25 %. Цека Литвы и Белоруссии мало внимания уделяет Мозырю. Между тем положение здесь исключительное, требует особого внимания. Необходимо перевести деньги до 15 млн. рублей, предписав Минску немедленно ассигновать кредиты на насущные нужды, без удовлетворения которых работа остановится. Из Минска направил сюда 2 партийных работников и в помощь им дал 8 человек, взятых мной из Москвы исключительно для партийной работы в деревне. Из Мозыря выезжаю в Речицу...

*Ландер*

*РЦЗВДНГ. Ф. 17. Воп. 65. Спр. 152. Л. 33.*

## За Пятлюрам — польскія легіянеры



П. І. Пашкін — начальнік Дняпроўскай ваеннай флатыліі

Доўгачаканы мір на Мазыршчыне быў кароткім. Ужо ў сярэдзіне красавіка 1919 г. зноў стала трывожна. Значная частка заходняга Палесся была акупіравана белапольскімі захопнікамі. Вайна пасоўвалася бліжэй да Мазыра. То там, то тут у навакольных лясах паявіліся банды. Многія з іх утвараліся на сродкі польскіх улад, і кіраўнікамі іх сталі выхадцы з польскай шляхты.

Савецкая ўлада прымала рашучыя меры па арганізацыі абароны Мазыра і заходніх подступаў да яго. У красавіку была сфарміравана Мазырская каравульная рота, якая пазней стала асновай Мазырскага стралковага палка. Байцамі роты сталі мазыране Якаў Цяслюк, Фёдар Пугач, Аляксандр Мужэнка, Іван Ляўковіч, Барыс Яцко, Мацвей Рудзько, Ілля Казак і многія іншыя. Каравульнай ротай камандаваў І. С. Прохараў, які праз некаторы час ужо стаў камандзірам батальёна.

Становішчам на подступах да Мазыра зацікавілася камандаванне Украінскага фронту. Для разведкі сіл ворага і для вядзення баявых дзеянняў з канца мая 1919 г. сталі прыходзіць з Кіева адно за адным судны Дняпроўскай ваеннай флатыліі (ДВФ).

У чэрвені з мазырскіх і калінкавіцкіх часцей, прыбыўшых рэчыцкіх і гомельскіх камуністаў, камсамольцаў і добраахвотнікаў пад камандаваннем былога данецкага шахцёра Я. А. Калюжнага быў сфарміраваны зводны атрад з 600 чалавек пры 7 кулямётах. Разам з маракамі ДВФ і 64-м палком 26 ліпеня атрад удзельнічаў у вызваленні ад палякаў Турава.

24 ліпеня ў Мазыр прыбыў прызначаны Рэвалюцыйным саветам Заходняга фронту надзвычайны камісар Мазырскага абарончага раёна А. І. Жабін. Разам з ім — 90 ваенных маракоў былой Чудскай ваеннай флатыліі на чале з камісарам-балтыйцам А. М. Кульбергам, механікам А. К. Сіўковым (апошні ў 1937 г. стаў камандуючым Балтыйскага флоту). Штаб А. І. Жабіна размясціўся ў доме № 4 на вул. Спаскай, штаб фарміруемай Прыпяцкай ваеннай флатыліі — у доме № 70 на гэтай жа вуліцы.

10 жніўня адбылася мазырская партканферэнцыя, дэлегатам якой ад камуністаў флатыліі быў П. А. Айзупет. (Ён жа ў 1917 г. быў дэлегатам VII (красавіцкай) Усерасійскай канферэнцыі, на якой сустракаўся з У. І. Леніным.) Важнейшым на канферэнцыі было пытанне абароны Мазыра і павета. У гэты ж дзень у горад са штаба Заходняга фронту прыбыў новы начальнік Прыпяцкай ваеннай флатыліі П. І. Пашкін.

У горадзе і павеце 10 жніўня было аб'яўлена асаднае становішча, пачалася эвакуацыя насельніцтва.

Лінія фронту праходзіла ўжо па рубяжы Петрыкаў — рака Убарць — Злодзін. Штаб 64-га палка 8-й стралковай дывізіі знаходзіўся ў Скрыгалаве. Такім чынам з пачатку верасня 1919 г. вайна ўжо разгарэлася на мяжы цяперашняга Мазырскага раёна. На поўдзень жа ад Прыпяці часцей Чырвонай Арміі не было, там дзейнічалі толькі партызанскія атрады.

Надзвычайны камісар раёна А. І. Жабін, начальнік флатыліі П. І. Пашкін, камандзір Мазырскага палка Малевіч, рэвалюцыйны камітэт прынялі рашучыя дзеянні па абароне Мазырскага вузла і ўсяго баявога ўчастка. Флатылія папоўнілася двума вартавымі су-

днамі «Звязда» і «Тураў». Ішла мабілізацыя ў Мазырскі стралковы полк. 8 верасня белапалякі ў жорсткім баі захапілі Петрыкаў. Але пратрымаліся там нядоўга — на другі дзень былі выбіты.

Абараняць павет выйшлі яго жыхары. Мазырскі полк папоўніўся добраахвотнікамі. Камуністы горада і павета Тураўскі, Рубінскі, Балазоўскі, Каган, Шустэрман, Багдановіч, Гольдэнберг, Завадскі, беспартыйныя Бялоцкі, Чырун, Гіршман, Жахоўскі і многія іншыя знайшлі сваё месца ў першых радах змагароў. Мазырскія абутнікі і краўцы шылі абутак і абмундзіраванне для байцоў.

Не стаяла ўбаку і інтэлігенцыя. 9 верасня працаўнікі народнай асветы ўручылі Мазырскаму стралковаму палку пашыты імі баявы Чырвоны сцяг. З гэтай нагоды на гарадской плошчы адбыўся парад чырвонаармейцаў палка і маракоў Прыпяцкай ваеннай флатыліі. На парад прыйшлі жыхары горада і павета, адбыўся ўрачысты мітынг. Быў зачытаны загад па Мазырскім стралковым палку, у якім выказвалася цвёрдая ўпэўненасць у канчатковай перамозе Савецкай улады.

Камандаванне 12-й арміі, улічваючы пагрозу новага наступлення палякаў на Мазыр, перакінула сюды падмацаванні. 10 верасня з Кіева прыбыў 58-мы Кіеўскі асобны стралковы полк чыгуначнай абароны, часці чацвёртай брыгады 44-й стралковай дывізіі, якой камандаваў да дня гібелі (30 жніўня) легендарны М. А. Шчорс.

З боку вёсак Буйнавічы і Злодзін, мястэчка Петрыкаў у сярэдзіне верасня вораг зноў пачаў наступленне больш моцнымі сіламі. 16 і 17 верасня былі захоплены Махнавічы і Мялешкавічы. Але праз некалькі дзён воіны Чырвонай Арміі і маракі ваеннай флатыліі выбілі палякаў з гэтых населеных пунктаў.

Гераічна змагаліся чырвонаармейцы Мазырскага стралковага палка. 30 верасня ў баі ля вёскі Злодзін (цяпер вёска Чырвонабярэжжа Лельчыцкага раёна) смерцю героя загінуў разведчык палка Макар Юшкевіч. Вылучыліся сваёй адвагаю мазыране Фёдар Лузан, Нічыпар Штукар, Аляксандр Шкуратоўскі. У загадзе па Мазырскім палку ад 6.10.1919 г. іх баявыя дзеянні былі пастаўлены ў прыклад усяму асабоваму складу. «...Конные разведчики Мозырского полка безукоризненно и доблестно воюют, особенно Лузан Федор. Он не раз своей самоотверженностью выводил батальон из затруднительного положения...»

Палякі рваліся да Мазыра. Першага кастрычніка яны зноў захапілі Петрыкаў і Буйнавічы. Аслабленыя роты 58-га палка адышлі на лінію Вялаўск — Глініца — Скалодзін — Канапелькі. У дапамогу палку з Мазыра на параходах у напрамку Скрыгалава тэрмінова былі перакінуты 200 чырвонаармейцаў Мазырскага палка.

У хуткім часе Мазырскі стралковы полк быў пераведзены на іншы ўчастак фронту. 16 лістапада ў палку змянілася і кіраўніцтва. У апошнім загадзе яго камандзіра Малевіча дадзена высокая ацэнка баявым дзеянням нядаўна сфарміраванага палка.

Тым часам на фронце ўсталявалася часова зацішша. У сувязі з тым, што на станцыі Мікашэвічы з 10 кастрычніка па 9 снежня праходзілі савецка-польскія перамовы, адбылася замена воінскіх палкоў на мазырскім участку фронту. Але ў хуткім часе перамовы былі спынены польскай дэлегацыяй, і баявыя дзеянні аднавіліся. 12 снежня белапалякі авалодалі мястэчкам Скрыгалаў. Начальнік участка В. Н. Васін дакладваў з Мазыра ў штаб 47-й стралковай дывізіі: «Нет сил восстановить положение у Скрыгалова. Я приказал партизанской роте Э. Ковальского из Ельска занять Махновичи, а из Мозыря роту резерва направить в Слободу Скрыгаловскую. Туда же направлен и взвод артиллерии».

У дакументах Расійскага дзяржаўнага архіва ВМФ захаваліся цікавыя

звесткі аб ролі Мазыра ў пашырэнні партызанскага і падпольнага руху ў тыле ворага ў 1919 г. Вядомы польскі рэвалюцыянер Эдуард Кавальскі — баявы сябра і паплечнік Ф. Кона, Ф. Дзяржынскага, Ю. Мархлеўскага, уваходзіў у Зафрантавое бюро пры 12-й арміі і ў канцы жніўня 1919 г. уладкаваўся на некаторы час у Мазыры. Ён павінен быў весці агітацыю ў войску праціўніка на фронце і ў яго тыле, ствараць партызанскія атрады і садзейнічаць руху паўстанцаў у белапольскім тыле. Асабліва актыўна Зафрантбюро разгарнула свае дзеянні пасля таго, як Мазыр наведаў член РВС 12-й арміі С. І. Аралаў. Ён выдаў Э. Кавальскаму чэкавую кніжку для забеспячэння партызанскіх атрадаў, 100 пар салдацкіх ботаў, ватныя штаны, фуфайкі, бялізну, новыя вінтоўкі, боепрыпасы.

У кастрычніку Э. Кавальскі накіраваў некалькі інструктараў у польскі тыл для арганізацыі там масавых паўстанняў. Сфарміраваны к пачатку снежня ў Мазыры партызанскі атрад «Бальшавік» перайшоў лінію фронту ў раёне Жытоміра. Яшчэ раней, 24 лістапада, адзін з партызанскіх атрадаў з Мазыра дасягнуў пінскіх балот і паспяхова дзейнічаў у раёне Дубровіцы. На шляху да месца дзеянняў атрад папоўніўся 75 добраахвотнікамі-палешукамі. Да 1 снежня быў сфарміраваны таксама і атрад «Пралетарый», у склад якога ўвайшло 115 чалавек.

Разам з Э. Кавальскім у Мазыры дзейнічаў вядомы рэвалюцыянер І. К. Апанскі, дапамагалі ім М. А. Андрэеў, Г. Б. Саф'ян і іншыя. З іх дапамогай у польскім тыле, у Петрыкаве, была арганізавана падпольная група камуністаў. Вось што пісаў з Мазыра ў Маскву Э. Кавальскі Ф. Кону 24 лістапада 1919 г.: «Много помогаем партизанам. Через прифронтовых крестьян пересылаем в тыл поляков литературу... Агитаторы из крестьян действуют более удачно, чем присылающиеся из частей комиссары. Они умело используют крестьянских мальчишек и с их помощью расклеивают листовки на польском языке за линией фронта... Повсюду поднимаются крестьяне и встречают мои отряды с объятиями. Крестьяне целыми партиями переходят фронт и требуют оружия, чтобы мстить. Даю оружие лишь партийным. Если бы было чем вооружить их всех поголовно, то, думаю, вскоре можно было бы перенести нашу борьбу из Мозыря в Люблин».

Камандзіры аднаго з польскіх штабоў паведамлялі, што ўсімі паўстаннямі ў іх тыле «руководит некий Ковальский из Мозыря. В декабре 1919 г. между болотами, по так называемой «солнечной дороге» севернее Сарн прорвался отряд в 300 человек»[1]. У дакуменце адзначаецца, што партызаны здолелі здзейсніць шэраг дыверсій на чыгунцы, раззброілі некалькі польскіх гарнізонаў.

14 снежня 3-ці батальён 421-га палка ў кароткім баі выбіў белапалякаў са Скрыгалава. Праз дзень чырвонаармейцаў змянілі маракі, якія 16 снежня атрымалі тут баявое хрышчэнне. Звыш 500 легіянераў атакавалі Скрыгалаў, але іх атакі захлынуліся ад меткіх стрэлаў маракоў. Некалькі дзесяткаў легіянераў было забіта і паранена, астатнія кінуліся ўцякаць.

20 снежня маракі здзейснілі вылазку ў тыл праціўніка і атакавалі белапалякаў на супрацьлеглым беразе Прыпяці ля вёскі Конкавічы. У час гэтай аперацыі вылучыліся байцы Скрыгалаўскага партызанскага атрада: камандзір Іван Ганчар, партызаны Лука Каласоўскі, Піліп Казак, Сцяпан і Якаў Пікузы, Цімафей Рудзько. Два польскія батальёны і эскадрон кавалерыі, якія не чакалі партызан, а мірна спалі, панеслі значныя страты, 6 гармат былі знішчаны. У ліку захопленых трафеяў было зімняе абмундзіраванне, якое скарысталі партызаны і маракі.

[1] Документы и материалы по истории советско-польских отношений (ноябрь 1918 г. — апрель 1920 г.). М., 1964. Т. 2. С. 396, 559.

Меліся забітыя і ў маракоў. У баі ля Конкавіч быў смяротна паранены камандзір узвода Георгій Беркум-Васільеў. Сабраўшы апошнія сілы, ён паспеў кінуць яшчэ дзве гранаты і знішчыць групу белапалякаў, сам пры гэтым загінуў. Загінуў і марак Мярэжка. Абодва былі пахаваны ў вёсцы Слабада.

Партызанскія атрады былі вельмі важнай баявой сілай, на якую абапіралася савецкае камандаванне, у тым ліку на Мазырскім баявым участку. У данясенні інфарматара палітаддзела 47-й стралковай дывізіі Андросава паведамляецца: «Военком 3-го батальона 423-го полка тов. Воропанов помог в организации партизанского отряда из крестьян деревень Балажевичи, Лешня, м. Скрыгалово и других. Ночью 1 декабря отрядом был сделан налет на деревню Новоселки, во время которого убито 37 поляков и взят один пулемет».

Успамінаючы пра гэты гераічны час, Я. С. Пікуза пісаў: «В конце ноября 1919 г. к нам в Скрыгалово пробрался связной В. И. Талаш с сообщением, что в Новоселках остановилась команда белопольских моряков с целью подготовки к созданию своей военной флотилии. Советское командование приняло решение — сделать налет на Новоселки силами партизан. Быстро сформировали партизанский отряд из жителей Скрыгаловской волости. Только из Скрыгалова в отряд вошло 36 человек. Совместным ударом нашего отряда и партизан В. И. Талаша все белопольские матросы в Новоселках были уничтожены. Многие из партизан позже влились в части Красной Армии, некоторые погибли. Тимофей Рудько, Лукьян Падило, Андрей Прокопенко остались в Скрыгалове и были расстреляны белополяками».

24 снежня рота маракоў, маючы каля 20 чалавек параненых і хворых, адбіла моцную атаку легіянераў на Скрыгалаў. 30 снежня пасля двухгадзіннага артабстрэла белапалякі сілай у 400 штыкоў і ўзвода кавалерыі зноў атакавалі Скрыгалаў. Страціўшы нямала сваіх людзей, легіянеры выцеснілі маракоў, чырвонаармейцаў і партызан са Скрыгалава і вёскі Белая. Хутка да палякаў прыйшло падмацаванне ў 200 кавалерыстаў, часці Чырвонай Арміі адступілі да Слабады. Вораг неадступна ішоў у напрамку на Мазыр. Толькі дзякуючы таму, што прыбылі дадатковыя сілы, нашым часцям удалося выправіць становішча пад Скрыгалавам. Гэта было ў апошні дзень, у апошнія гадзіны 1919 года.

Польскае камандаванне працягвала папаўняць войскі, якія наступалі на Мазыр. 18 студзеня 1920 г. белапалякі сканцэнтравалі свой удар на слабыя месцы Мазырскага баявога ўчастка. На другі дзень яны авалодалі мястэчкам Скрыгалаў, вёскамі Белая, Майсееўка, Слабада, Раманаўка, Мялешкавічы.

Неабстраляныя, толькі што сфарміраваныя войскі Гомельскай брыгады былі ўключаны ў склад прыбыўшых часцей 139-й брыгады 47-й стралковай дывізіі, якая заняла абарону на мазырскім баявым участку. Стала магчымым авалодаць страчанымі рубяжамі. У 10 гадзін раніцы 27 студзеня моцным ударам ля вусця ракі Пціч у напрамку на вёску Міхнавічы з поўначы на поўдзень цераз раку Прыпяць наступаючыя чырвонаармейцы і партызаны стварылі пагрозу групоўкам белапалякаў на заходніх рубяжах ля Мазыра. Зноў былі вызвалены Белая, Майсееўка, Слабада, Скрыгалаў. Баючыся быць акружанымі, белапалякі без бою пакінулі і Мялешкавічы.

Цяжкія баі пад Мазыром не сціхалі ні на адзін дзень. Польскае камандаванне імкнулася захапіць Мазыр, савецкае ж камандаванне — утрымаць свае пазіцыі, выканаць дырэктыву галаўкама С. С. Каменева «принять меры к обязательному сохранению за нами железной дороги Бердичев — Мозырь — Жлобин...». (Директивы Главного командования Красной Армии (1917—1920). Сборник документов. М., 1969. С. 496.) Але неабходных падмацаванняў чырвонаармейцам не далі, бо

сілы патрабаваліся на іншых напрамках франтоў.

7 лютага група белапалякаў з 250 чалавек, маючы 4 кулямёты і 2 бамбамёты, атакавала вёску Раманаўка і перарэзала дарогу на Слабаду Скрыгалаўскую. Раніцай 8 лютага вораг атакаваў і заняў Слабаду, Раманаўку, Майсееўку, Зімовішчы. Чырвонаармейцы адступілі да вёскі Прудок. К канцу дня 8 лютага войскі савецкіх часцей сканцэнтраваліся і падрыхтаваліся да контрнаступлення, якое пачалося ў 18 гадзін з вёсак Касцюковічы, Прудок і Мялешкавічы. Позна ноччу 9 лютага імклівым штыкавым ударам чырвонаармейцы і партызаны выбілі ворага з захопленых вёсак. Белапалякі вымушаны былі адступіць і з вёскі Лешня, дзе каля 40 легіянераў трапілі ў палон. У гэтым баі загінуў партызан Скрыгалаўскага партызанскага атрада Лука Іванавіч Каласоўскі.

Праз тыдзень зноў разгарнуліся ўпартыя баі за Скрыгалаў. Некалькі разоў мястэчка пераходзіла з рук у рукі. Зноў нашы войскі вымушаны былі адысці да вёскі Прудок. У сярэдзіне лютага разведчыкі выявілі на мазырскім напрамку яшчэ тры новыя палкі ворага, перакінутыя з-пад Бабруйска. Усяго групоўка ворага стала налічваць 7300 штыкоў і 1300 шабляў супраць 5690 штыкоў і 50 шабляў чырвонаармейцаў. Маючы большыя сілы і багацейшы вопыт вядзення бою, праціўнік 21 лютага зноў захапіў вёскі Каменка, Мялешкавічы, Махнавічы і знаходзіўся за 12 вёрст ад Мазыра.

Рэўваенсавет 12-й арміі прыняў рашэнне накіраваць у Мазыр новы атрад маракоў Дняпроўскай флатыліі, які быў тэрмінова сфарміраваны ў Гомелі з экіпажаў флатыліі і стаў называцца марскім берагавым атрадам (1-шы МБА). 24 лютага атрадам былі заняты амаль без бою вёскі Жахавічы, Майсееўка, Слабада Скрыгалаўская. На заходнім участку абароны Мазыра дзейнічалі таксама прысланыя з Гомеля атрад Дыбенкі, разведатрад Балдзенкі,



І. С. Каралёў — жыхар Мазыра, марак Дняпроўскай ваеннай флатыліі

37-мы асобны батальён, партызаны, атрад мазырскіх камуністаў. 25 лютага маракі з дапамогай партызан В. І. Талаша здзейснілі рэйд за Прыпяць; выбілі праціўніка з вёсак Кацуры і Мышанка. У баі загінулі маракі І. Г. Барт і І. Ф. Кавалёў, якія пахаваны ў Слабадзе. У 421-м палку, штаб якога ў сярэдзіне лютага 1920 г. размяшчаўся ў Махнавічах, таксама былі страты.

Становішча на мазырскім баявым участку пагоршылася к пачатку сакавіка. Часці 139-й брыгады былі абяссілены. Вясной 1920 г. на фронце бушаваў сыпны тыф. У палках засталося па 200—300 штыкоў. На пазіцыях фронту ў 170 кіламетраў абарону ўтрымлівала каля 1500 чырвонаармейцаў, маракоў і партызан, супраць якіх было 7 тысяч штыкоў і 1700 шабляў ворага. Часта групы абаронцаў Мазыршчыны, якія налічвалі 30—40 чалавек, выбівалі з вёсак і сёл буйныя сілы белапалякаў у 300—500 легіянераў. У такіх выпадках чырвонаармейцам дапамагала артылерыя бронепаяздоў, якіх на мазырскім участку было чатыры.

Па пэўных прычынах на подступах да Мазыра намечаная змена войск Чырвонай Арміі затрымалася. Гэта пагоршыла становішча. Польскае камандаванне спланавала нанесці ўдар па горадзе адначасова з трох бакоў. Другая кавалерыйская брыгада праціўніка на правым флангу наносіла ўдар у напрамку Калінкавіч. 18-я пяхотная брыгада абыходзіла Мазыр з поўдня на Барбароў і Нароўлю. 17-я пяхотная брыгада




Помнік маракам Дняпроўскай ваеннай флатыліі, якія загінулі ў 1920 г. В. Слабада

палякаў дзейнічала ў цэнтры на Мазыр і Калінкавічы з захаду.

З-за вясновага бездарожжа адставалі абозы 57-й стралковай дывізіі. Легіянерам, у якіх было шмат кавалерыі, ранняя вясна не перашкаджала, а, наадварот, дапамагла вырашыць задачы абходаў, нечаканых налётаў. Крывавыя баі разгараліся ўсё больш і больш. Цяжкімі былі яны і 4 сакавіка каля вёсак Слабада, Прудок, Мялешкавічы, Малы Бокаў, на бліжэйшых подступах да Мазыра. На барацьбу з ворагам былі кінуты апошнія рэзервы: каравульная каманда гарнізона, штабныя работнікі 139-й брыгады, атрад мазырскіх рабочых і камуністаў. Вёскі Слабада і Майсееўка некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Падмацаванняў так і не паступіла. Развязка падзей каля горада набліжалася з кожнай гадзінай.

Ноччу 5 сакавіка вялікая групоўка легіянераў, пяхоты, кавалерыі здолела прасачыцца ў тыл абаронцаў Мазыра. На досвітку палякі былі ўжо ў горадзе. Малыя групы чырвонаармейцаў, камуністаў і рабочых адчайна супраціўляліся, але вымушаны былі з боем адыходзіць за Прыпяць. Бой у горадзе ішоў увесь дзень. Камісар брыгады Мікалай Сцяпанавіч Данілеўскі вырашыў адступіць толькі тады, калі будуць знішчаны дакументы штаба і спісы камуністаў брыгады. Ён добра ўяўляў, што гэта будзе каштаваць яму жыцця. Па словах аднаго з белапольскіх афіцэраў, у гэтым баі загінула больш палякаў, чым за ўвесь час баёў у горадзе.

У той жа дзень вораг заняў і Калінкавічы. Рэшткі 417-га палка і 1-га марскога берагавога атрада працягвалі змагацца каля вёскі Слабада. Дапамагчы акружаным байцам не было каму. Пахаваўшы загінуўшых на мясцовых могілках, атрад з цяжкасцю прарваў акружэнне каля вёскі Касцюковічы і фарсіраваў Прыпяць. Каля Калінкавіч зноў прарвалі кальцо і пайшлі на ўсход.

Хмары белапольскай акупацыі навісалі над Мазыршчынай да канца чэрвеня 1920 года. Але Палессе не змірылася з акупацыйным становішчам і паднялося на барацьбу з ворагам.

*І. Краўцоў*

## Камісар Данілеўскі

У Мазыры на доме № 32 па вуліцы Леніна ёсць мемарыяльная дошка з надпісам: «Тут у 1920 годзе, змагаючыся з белапалякамі, па-геройску загінуў верны сын Радзімы Мікалай Сцяпанавіч Данілеўскі, камісар брыгады 41-й дывізіі»[1].

---

[1] На мемарыяльнай дошцы недакладнасць. Трэба чытаць: «...камісар брыгады 47-й дывізіі».

Нарадзіўся Мікалай Сцяпанавіч у 1892 годзе ў сям'і прыказчыка харкаўскіх магазінаў і праз шэсць год застаўся без бацькі. У сям'і склалася цяжкае матэрыяльнае становішча, і адзінаццацігадовы Коля вымушаны быў шукаць свой кавалак хлеба. Гаротнае дзяцінства, праца па 16 гадзін у суткі не зламалі юнака. Дапамагла яму і вялікая прага да ведаў. Увесь вольны час ён аддаваў чытанню кніг. Юнака ў хуткім часе прыкмецілі старэйшыя таварышы — удзельнікі рэвалюцыйнай барацьбы. Яны знаёмілі яго з бальшавіцкай літаратурай, вучылі адстойваць інтарэсы рабочых. Так у чатырнаццаць год Данілеўскі пачаў рэвалюцыйную барацьбу, а ў васемнаццаць уступіў у бальшавіцкую партыю. Ён быў адным з актыўных членаў харкаўскай групы РСДРП(б).

Работа ў прафсаюзах, кіраўніцтва легальнымі арганізацыямі партыі, арганізацыя забастовак, нелегальная работа сярод салдат — вось тая дзейнасць, якую вёў Мікалай Сцяпанавіч у Харкаве. У гады новага рэвалюцыйнага ўздыму ў Расіі ён падтрымліваў цесную сувязь з членамі думскай бальшавіцкай фракцыі Г. І. Пятроўскім і М. К. Муранавым. Потым турма, катарга. Лютаўская рэвалюцыя вызваліла Данілеўскага, і ён з першых жа дзён пачаў працаваць над арганізацыяй і згуртаваннем сіл партыі. Неўзабаве яго выбралі членам першага легальнага харкаўскага камітэта бальшавікоў.

Калі ў Петраградзе перамагла Кастрычніцкая рэвалюцыя, Харкаўскі камітэт РСДРП(б) стварыў свой орган барацьбы за ўладу Саветаў, у склад якога разам з Арцёмам (Сяргеевым) увайшоў і Данілеўскі.

Кіруючыся ўказаннямі У. І. Леніна — хутчэй склікаць Усеўкраінскі з'езд Саветаў, бальшавікі Украіны разгарнулі падрыхтоўку да яго. З'езд адбыўся 11—12 снежня 1917 г., ён прагаласаваў за пераход усёй улады на Украіне ў рукі Саветаў і выбраў Цэнтральны выканаўчы камітэт. На першым


М. С. Данілеўскі

пасяджэнні Данілеўскі быў зацверджаны членам прэзідыума і сакратаром ЦВК Украіны. На гэтай пасадзе ён знаходзіўся да сярэдзіны 1918 года.

Пачалася грамадзянская вайна. Мікалай Сцяпанавіч узначаліў створаны з харкаўчан камуністычны атрад, вёў баі пад Крэменчугом, Барвенкавам... Чырвоны камісар праяўляў выключную мужнасць. Адзін са старэйшых харкаўскіх бальшавікоў В. Маргуноў расказвае: «У поспеху аперацыі пад Барвенкавам галоўную ролю адыграў Данілеўскі. Дзякуючы ўласцівай толькі яму энергіі ўдалося падняць настрой чырвонагвардзейцаў. Націск нашых часцей быў настолькі хуткім, што немцы, не паспеўшы адступіць, рассеяліся па вёсках».

Затым баі пад Луганскам, Мілеравам, гераічны паход часцей Чырвонай Арміі пад Царыцын. За ўдзел у абароне Царыцына Данілеўскі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У адным з баёў з войскамі Краснова загінуў яго лепшы сябра Руднеў — вядомы герой грамадзянскай вайны. А ў хуткім часе ён і сам быў цяжка паранены.

Летам 1919 г. Данілеўскі зноў на фронце, цяпер ужо камісар камуністычнай брыгады 47-й дывізіі. Брыгада Данілеўскага перакідваецца пад Мазыр для аховы граніц Украіны і Беларусі. На Палессі тады таксама было неспакойна. Вялася барацьба з бандамі Цюцюнніка, Струка і іншых атаманаў. Часта адбываліся сутычкі з польскімі легіянерамі.

Вясной 1920 г. польскія войскі напалі на савецкія часці. Пад ударам аказалася і брыгада Данілеўскага, якая стаяла пад Мазыром і ў самім горадзе. Завязаўся бой з праціўнікам, сілы якога ў тры разы пераўзыходзілі нашы войскі. Удар быў нечаканым, і чырвоныя, не паспеўшы сабраць штабныя дакументы, адступілі на левы бераг Прыпяці. Легіянеры святкавалі перамогу. Але раптам з двухпавярховага будынка мазырскага павятовага ваеннага начальніка, дзе размяшчаўся штаб брыгады, пачалі раздавацца частыя прыцэльныя выстралы. Палякі некалькі разоў спрабавалі штурмам узяць будынак, але зноў і зноў адступалі назад.

Толькі вечарам легіянеры ўварваліся ў штаб. У гэты час раздаўся выстрал. У печцы яшчэ дагаралі штабныя дакументы, а на падлозе ляжалі трупы абаронцаў штаба брыгады, у тым ліку і М. С. Данілеўскага. Да апошняга патрона змагаўся адважны камісар...

*М. Капач*

**ТЭЛЕГРАМА № 599**
**упаўнаважанага ЦК РКП(б) і УЦВК па Смаленскай і Мінскай губернях К. І. Ландара**

Москва, Цека РКП, Стасовой. *19 ліпеня 1919 г.*
Копии: Совнарком, Ленину, ВЦИК, Серебрякову

В связи с последним циркулярным письмом ЦК отдал распоряжение всем уездам Смоленской и Минской (губерний) о неуклонном проведении сего (циркуляра) в жизнь под руководством моих сотрудников. Дал конкретные указания применительно к местным условиям. Борьба с дезертирством в Смоленской (губернии) протекает успешно, в Минской слабо. Сейчас принял меры к усилению. Контроль налаживаю. К ревизии Главлеса и Рупвода приступлено, по предварительным данным работа слаба. Из Мозырскага уезда заготовленные материалы не будут вывезены, по приезде Иоффе согласую работу. Бандитизм в Мозырском (уезде) крайне развился в последние дни. Посланы отряды. Продовольственная политика Минской (губернии) неудовлетворительна: всюду свободная торговля, рабочие ничего не получают. Снабжение местных гарнизонов по-прежнему. Солдаты попрошайничают, в частности в Бобруйске. Необходимо принять срочные меры из центра.

*Ландер*

*РЦЗВДНГ. Ф. 17. Воп. 65. Спр. 26. Л. 12.*

**ЗАГАД № 21 ПА МАЗЫРСКІМ СТРАЛКОВЫМ ПАЛКУ**

г. Мозырь *9 верасня 1919 г.*

От имени всего Мозырского стрелкового полка благодарю школьных работников города Мозыря за драгоценный подарок полку — Красное Знамя. Я уверен, что борцы за пролетариат в лице красноармейцев с оружием в руках высоко будут держать это Знамя, окрасят его своей кровью, но все-таки окончательно уничтожат слуг буржуазии и приспешников царя и выбросят их за борт новой жизни, как пчелы выбрасывают из ульев трутней. И тогда, возвратясь к своим семьям, мы опять увидим плоды Ваших работ по подготовке молодого поколения, в лице которого мы найдем себе хороших помощников к устройству нашего общего улья, нашей молодой социалистической Советской Республики, вспомним, что Вы, кроме своей работы, еще оказывали поддержку Красной Армии отчислениями из своего скудного содержания.

И опять мы приносим Вам горячую благодарность за Ваши усилия помочь пролетариату, пойдем тогда с Вами рука об руку вперед, гордо и высоко держа Красное Знамя.

А теперь, товарищи, пока будем пробираться по разным тропинкам, которые приведут нас к одной светлой и новой жизни.

Еще раз благодарю Вас, товарищи, за Ваше стремление помочь окончательному освобождению пролетариата от его эксплуататоров и еще не уснувших царских слуг.

Врид командира полка *Трусевич*
Политком *Анисимов*

*РДВА. Ф. 3899. Воп. 2. Спр. 4. Л. 24.*

### З РЭЗАЛЮЦЫІ СХОДУ МАРАКОЎ ПРЫПЯЦКАЙ ВАЕННАЙ ФЛАТЫЛІІ Ў г. МАЗЫР

*10 верасня 1919 г.*

«...Нас ничто не устрашит: ни поляки, ни Деникин, ни Петлюра. Били мы уже этих белогвардейцев и будем бить до последнего конца, пока не будет очищен весь мир от белогвардейской сволочи и банды... Дайте нам снаряды, обмундирование, провизию, и мы будем стоять до последнего...»

*Расійскі дзяржаўны архіў Ваенна-марскога флоту (РДАВМФ). Ф. р-139. Воп. 2. Спр. 5. Л. 10.*

### З ЗАГАДА КАМАНДЗІРА МАЗЫРСКАГА СТРАЛКОВАГА ПАЛКА

*16 лістапада 1919 г.*

«...При тяжелых условиях вступил я в командование полком, только что начинавшим формироваться. Оторванность от центральных органов снабжения и управления воинскими частями, отсутствие точных руководящих указаний, необеспеченность обмундированием и другим сильно тормозили превращение полка в мощную боевую единицу. Но ... полк все же сумел окрепнуть, стать более или менее внушительной военной силой. 1-й батальон целый месяц с честью выполнял задачи по защите территории Советской Республики, не уступив ни пяди ее.

Самое главное сделано. Полк окончательно сформирован, а часть его получила боевое крещение под Красным Знаменем Мозырского стрелкового полка. Благодарю моего помощника Трусевича, адъютанта Бугурова, командиров: 1-го батальона — Прохорова, 3-го батальона — Копачева, 1-й роты — Ясинского, 2-й роты — Богдановича, 3-й роты — Боровика, 4-й роты — Зайцева, 7-й роты — Окарского...

Командир полка Малевич, врид военкома Бабеня».

*РДАВМФ. Ф. р-139. Воп. 2. Спр. 5. Л. 15.*

## Канец акупацыі

Чатыры месяцы заставалася Мазыршчына пад белапольскай акупацыяй. Становішча падпольшчыкаў у Мазыры было цяжкім, хоць да работы ва ўмовах акупацыі рыхтаваліся загадзя. Кіравалі падполлем М. Андрэеў, Г. Саф'ян і А. Пракапчук. Апошні (будучы вучоны-медык, акадэмік АН Беларусі) прыбыў пасля таго, як горад быў заняты белапалякамі, але хутка вярнуўся ў Брэст-Літоўск. Андрэеў і Саф'ян вялі патрыятычную работу на месцы, згуртоўвалі працоўных да барацьбы з ворагам.

Акупанты ўвялі свой жорсткі рэжым, кругласутачны кантроль за жыхарамі на вуліцах і ў дамах, здзекаваліся з насельніцтва, білі, катавалі. У кожнай вёсцы былі расстраляныя ці павешаныя. У Бабрах на вачах у 55-гадовай сялянкі А. Г. Бобр яны павесілі 18-гадовага сына Дзмітрыя толькі за тое, што два яго браты ваявалі ў Чырвонай Арміі. У Міхалках былі павешаны браты Фёдар і Павел Каленікі, а таксама Іван Міхайлавіч Кухнавец, у Скрыгалаве расстралялі трох былых партызан, у Козенках быў забіты С. Н. Сузько — за тое, што не хацеў па загаду вывозіць нарабаванае ў насельніцтва



І. Д. Трусевіч — камісар Мазырскага стралковага палка, удзельнік барацьбы з польскімі інтэрвентамі. 1920



Ц. С. Хвесін

і вайсковы груз (насценгазета Гомельскага аддзялення РОСТА № 273 ад 6 ліпеня 1920 г.).

Акт надзвычайнай камісіі з Мазыра сведчыць аб тым, што ў вёску Мялешкавічы ноччу 26 чэрвеня з Ельска прыбыў 22-гі польскі пяхотны полк, які распачаў жорсткі грабеж і здзекаванне з сялян, асабліва жанчын. 27 чэрвеня бясчынствы працягваліся. З наступленнем цемнаты акупанты акружылі вёску і падпалілі яе ў шасці месцах, адкрыўшы агонь з кулямётаў, каб не даць магчымасці жыхарам тушыць палаючыя дамы. Сям'ю аднаго савецкага служачага белапалякі зачынілі ў доме, а затым яго падпалілі, але праз глухі ход ахвяры выратаваліся. Былі расстраляны 60-гадовы бацька вясковага старасты Іван Жыльскі і пяць юнакоў, тры жыхары згарэлі жывымі. У той дзень у вёсцы згарэла 136 дамоў з усімі гаспадарчымі пабудовамі і нажытым скарбам. У гэты ж дзень у вёсках Мялешкавіцкай воласці бясчынствы тварыў 41-шы польскі полк, спаліўшы яшчэ 36 дамоў і знішчыўшы дзесяткі яўрэйскіх сем'яў.

Польскай ахранцы ўдалося арыштаваць групу падпольшчыкаў з Калінкавіч і Мазыра. У чэрвені 1920 г. былі павешаны ў гарадскім садзе на беразе Прыпяці ў прысутнасці жыхароў Рыгор Салаўёў — былы палітработнік аднаго з палкоў Чырвонай Арміі, які трапіў у палон пад Рэчыцай, Ш. Кірпічнікаў, рабочы фабрыкі «Маланка», і Хая Кацман, падпольшчыца з Калінкавіч. Мазыране запомнілі апошнія словы Р. Салаўёва: «Я паміраю за свабоду...»[1] Дэфензіва (польская контрразведка) дабіралася і да групы М. Андрэева, але ён паспеў схавацца ў роднай вёсцы Мялешкавічы. 16 чэрвеня быў арганізаваны налёт на кватэру Г. Б. Саф'яна, які жыў на Слуцкай вуліцы. Камуніст быў арыштаваны. Разам са Злотнікавым Саф'ян быў асуджаны ваенна-палявым судом Польшчы і адпраўлены ў канцлагер.

Але зламаць супраціўленне жыхароў Мазыршчыны белапалякам не ўдалося. Актыўна дзейнічалі партызанскія атрады ў вёсках павета (Слабадскі, Ляшнянскі, Майсееўскі, Мялешкавіцкі і іншыя атрады). У адным з дакументаў ад 13 чэрвеня паведамляецца: «В Мозыре вспыхнуло восстание против польских оккупантов. Для подавления восстания выслан из Речицы 22-й Седлецкий полк...»[2]

18 мая загадам па войсках Заходняга фронту Чырвонай Арміі створана Паўднёва-Мазырская (з 11 чэрвеня — Мазырская) група войск фронту пад камандаваннем Ціхана Серафімавіча Хвесіна (1894—1938). Гэта быў актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны. Ён быў камандуючым арміі на Доне, у Туркестане і на іншых франтах. У склад групы ўваходзілі 57-я і 24-я стралковыя дывізіі, некалькі брыгад, тры бронепаязды з дэсантнікамі, паветраплавальны атрад, 2 бронеатрады, група суднаў Дняпроўскай флатыліі і іншыя часці.

19 чэрвеня войскі мазырскай групы фарсіравалі Днепр, авалодалі Рэчыцай і накіраваліся на Васілевічы — Хойнікі. Адначасова ў вусці Прыпяці ішло вытраліванне польскіх мін, каб судны ДВФ маглі ўзаемадзейнічаць з наступаючымі на Мазыр часцямі Чырвонай Арміі. 25 чэрвеня дзякуючы рачной флатыліі была вызвалена На-

[1] Борьба за Советскую власть в Белоруссии. Сборник документов. Мн., 1971. Т. 2. С. 341.
[2] Тамсама. С. 329.

роўля, на другі ж дзень белапалякі ўцяклі з Барбарова.

Наступленне на Мазыр развівалася і з поўдня, дзе дзейнічаў левы фланг 24-й дывізіі. У Новай Рудні (цяпер Ельскі р-н) быў падбіты браняпоезд праціўніка «Сікорскі», які трапіў у рукі савецкіх войск. 27 чэрвеня кананерскія лодкі «Мощный», «Губительный» і «Грозный» падышлі да вёскі Нагорная і ўступілі ў артылерыйскую дуэль з батарэямі і бронепаяздамі праціўніка каля Мазыра і Калінкавіч. Сярод белапалякаў пачалася паніка, калі снарады канлодкі «Мощный» сталі рваццa на прыстані Мазыра і адзін з іх разарваўся каля борта парахода, дзе знаходзіўся штаб начальніка 9-й польскай пяхотнай дывізіі.

Трапіўшы патаемна ў горад, разведчыкі-маракі і чэкісты сустрэлі разведчыкаў 215-га палка 24-й дывізіі. Яны захапілі ў палон начальніка паліцыі Мазыра, аднаго з прыставаў і тых, хто караў патрыётаў. Быў арыштаваны мясцовы мільянер Зільберштэйн, які ўдзельнічаў у арганізацыі пакаранняў і тэроры супраць рабочых Мазыра і чыгуначнікаў Калінкавіцкага вузла. 20 карнікаў і контррэвалюцыянераў праз некаторы час былі прыгавораны да расстрэлу. *(РДАВМФ. Ф. р-402. Воп. 2. Спр. 210. Л. 5.)*

Раніцай 29 чэрвеня да мазырскай прыстані падышлі канлодкі «Мощный» і «Грозный», тральшчык «Патрон». На борце «Мощного» знаходзіўся камандуючы ДВФ П. І. Смірноў і ваенкам флатыліі Я. Я. Чадарайн. Маракі спешна прыступілі да тушэння падпаленага белапалякамі драўлянага моста. Аднак яго выратаваць не ўдалося. Узарваным быў і чыгуначны мост. У 15 гадзін 30 хвілін таго ж дня ў Мазыр уступіў 215-ты полк. За правядзенне аперацыі па вызваленні Мазыра камандуючы групай Ц. С. Хвесін быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Гэтым жа ордэнам быў узнагароджаны і камандзір 4-га палка 2-й кавалерыйскай брыгады Пётр Мусаеў. Полк пад яго камандаваннем вызначыўся ў баях каля вёсак Агароднікі, Шарэйкі, Лубня і Прудок, захапіў у палон 216 белапалякаў з 6 кулямётамі, 500 ручнымі гранатамі і іншымі трафеямі (усе вёскі Калінкавіцкага раёна, акрамя Лубні).

Расчысціўшы за некалькі гадзін праходы пад узарваным чыгуначным і спаленым драўляным мастамі, судны флатыліі пайшлі ўверх па Прыпяці. З іх дапамогай 30 чэрвеня вёскі Загорыны, Мерабель, Касцюковічы, Жахавічы, а 1 ліпеня Скрыгалаў і Слабада былі вызвалены. Усе воласці павета былі ахоплены паўстаннямі. Партызанскія атрады ў многіх месцах яшчэ да падыходу наступаючых часцей Чырвонай Арміі займалі вёскі. 8 ліпеня баі праходзілі ўжо на заходніх межах раёна. У зводках камандзіра Асобага стралковага дывізіёна М. Ефанешнікава і ваенкама А. Цярлецкага адзначалася, што к канцу дня 8 ліпеня дывізіён знаходзіўся на лініі Шаставічы — Глініца — Скалодзін — Астражанка. Вораг адступаў на Майсеевічы — Снядзін, на Буйнавічы — Злодзін (цяпер тэрыторыя Лельчыцкага і Петрыкаўскага раёнаў)...

Фронт ад Мазырскага раёна адышоў на захад. Жыццё ў Мазыры і павеце стала наладжвацца. Быў створаны Мазырскі павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з У. Р. Кажурам, сакратаром стаў Я. Сарокін. 2 ліпеня камандуючы флатыліі П. І. Смірноў назначыў начальнікам гарнізона Мазыра начальніка дэсантнага атрада В. Федарэнку, а камендантам горада стаў камандзір першага кавалерыйскага эскадрона ваенмор Лейбнер. У першым загадзе В. Федарэнкі паведамлялася: «Всем гражданам, учреждениям, торговым предприятиям немедленно приступить к работе, приложить все усилия, чтобы быстрее возобновить мирную жизнь, разрушенную польской шляхтой, тем ужасом, который царил при поляках... Призываю население к спокойствию и порядку, помня, что враг оставил

своих агентов, кои будут играть на умах малосознательных и тем нарушать течение жизни и мешать налаживанию жизненного порядка...» *(Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 3. Л. 8.)*

Жыхары Мазыра і павета, спазнаўшы жорсткасць варожай акупацыі, падтрымлівалі Савецкую ўладу. Трэба было як мага хутчэй ліквідаваць цяжкія вынікі чатырохмесячнага гаспадарання польскай шляхты. Усё, што мела хоць якую каштоўнасць, было раскрадзена, вывезена. Склалася катастрафічнае становішча з забеспячэннем насельніцтва прадуктамі. Мазырскі валрэўкам паведамляў у тэлеграме ў Маскву, што павет зусім разрабаваны.

Валасныя рэвалюцыйныя камітэты тэрмінова былі арганізаваны ў Мялешкавічах, Міхалках, Слабадзе, Скрыгалаве і іншых вёсках.

У Мялешкавічах валрэўкам узначаліў К. Качэня, былы камандзір партызанскага атрада, членамі рэўкама абраны А. Жыльскі, М. Жыльскі, Ц. Пауленка, А. Дарашэвіч, 27 ліпеня 1920 г. быў скліканы 1-шы з'езд прадстаўнікоў сельскіх Саветаў Мялешкавіцкай воласці. Абмяркоўваліся пытанні аб дэзерцірах, пастаўцы падвод на дзяжурства валрэўкаму, зберажэнні лясоў ад пажараў, аказанні дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў і пацярпелым ад белапольскіх акупантаў.

Значна пацярпела ад белапольскага нашэсця і Міхалкаўская воласць. Браты Каленікі былі павешаны, ворагі жорстка здзекаваліся з іх трупаў. Селяніну Цыркуну на грудзях цвікамі прыбілі аркуш паперы з надпісам «Камуніст», калі ён быў яшчэ жывы. На агульным сходзе жыхары Міхалак гнеўна асудзілі зверствы белапалякаў і прынялі рэзалюцыю, якая заклікала да помсты ворагу: «Мы, грамадзяне сяла Міхалкі, зведаўшы на сабе цяжкі прыгнёт польскіх улад, далі клятву: усе сілы і сродкі аддаць на барацьбу з нізкім і лютым ворагам пралетарыяту, а ўсім здольным насіць зброю — па першым закліку ўзяць яе ў рукі і як адзін чалавек стаць у рады доблеснай Чырвонай Арміі... Усе, ад малога да вялікага, шлём лютаму ворагу і душагубу — польскаму панству сваё вечнае праклянцце і помсту».



Дорах Адам Піліпавіч — жыхар в. Міхалкі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне на Паўднёвым і Заходнім франтах, вызначыўся ў барацьбе з польскімі інтэрвентамі



Гарэлька Павел Паўлавіч — жыхар в. Міхалкі, удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях у Маскве і ў грамадзянскай вайне на Заходнім фронце, арганізатар Савецкай улады ў Міхалкаўскай воласці

Міхалкаўскім валрэўкамам, які ўзначаліў М. Калеснік, была праведзена вялікая работа па ўстанаўленні грамадскага парадку ў воласці. Былі прызначаны вартаўнікі для аховы лясоў ад пажараў, пасеваў і сенажацяў, на ўлік узята рухомая і нерухомая маёмасць саўгасаў, якая аддавалася пад адказнасць батрацкіх камітэтаў, а таксама паравыя, вадзяныя і конныя млыны. З'езды прадстаўнікоў сельскіх Саветаў воласці вырашалі пытанні аб раздзеле зямлі паміж сялянамі і саўгасамі. Міхалкаўскі валасны рэўкам прымаў актыўны ўдзел у правядзенні нядзелі хворага і параненага чырвонаармейца.

Вялікую работу па аднаўленні і ўмацаванні Савецкай улады ў вёсках вёў і Скрыгалаўскі валрэўкам, створаны 8 ліпеня. У склад яго ўвайшлі М. Казнан, А. Белы, Н. Курмаз. У 14 населеных пунктах воласці былі арганізаваны сельскія Саветы, адкрыты валасная бібліятэка і культурна-асветніцкі гурток. Санітарныя камісіі змагаліся

з эпідэміямі. З вялікімі цяжкасцямі былі адноўлены і адрамантаваны масты і дарогі, наладжана сувязь з павятовым цэнтрам. З жніўня 1920 г. была склікана валасная канферэнцыя па правядзенні нядзелі хворага і параненага чырвонаармейца.

Слабадскі валрэўкам, які пачаў работу 1 ліпеня 1920 г., узначалілі М. Лук'яновіч, Казлоў і Чарняк, актыўныя ўдзельнікі барацьбы за Савецкую ўладу.

У Мазыры было адкрыта паштова-тэлеграфнае аддзяленне, у некаторых валасцях арганізавана конная сувязь. У. Ф. Кажура паведамляў старшыні Мінскага губваенрэўкама А. Р. Чарвякову, што ў Мазыр прыязджаюць людзі з мандатам Гомельскага губваенрэўкама, аддаюць свае распараджэнні. Пытанне, узнятае старшынёй Мазырскага рэўкама, было прынцыповым, размова ішла аб спробе ўключыць Мазыр у Гомельскую губерню, якая ўваходзіла тады ў склад РСФСР.

Пачаўся падзел памешчыцкай зямлі сярод беднаты. У саўгасах павета пасля выгнання польскіх інтэрвентаў амаль не засталося коней, буйной рагатай жывёлы. Быў узяты на ўлік і пад ахову саўгасны інвентар, пачаўся яго рамонт. У сувязі з вялікай небяспекай эпідэміі былі створаны дэзінфекцыйныя атрады, пачалася санітарная чыстка горада, закупляліся медыкаменты. Наладжвалася грамадскае харчаванне. У дакладзе аб дзейнасці валрэўкама 20 ліпеня адзначалася, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці, настрой у горадзе і павеце добры, насельніцтва радуецца вызваленню ад белапалякаў, наступленню мірнага жыцця...

*І. Краўцоў, Я. Фарбераў*

## Слабада партызанская

Жыхары вёскі Слабада Скрыгалаўская ў гады грамадзянскай вайны актыўна змагаліся ў тыле супраць нямецкіх



Жыхар Мазыра Пратасавіцкі Мікалай Міхайлавіч сярод байцоў-чапаеўцаў (у першым радзе ў цэнтры)

і белапольскіх захопнікаў, пятлюраўцаў і балахоўцаў.

**Ганчар Іван Дзмітрыевіч** нарадзіўся ў 1889 г. у сям'і беднага селяніна. У дзяцінстве працаваў у маёнтку пана Снядзецкага, дзе спазнаў сацыяльную несправядлівасць. У 1908 г. быў мабілізаваны ў царскую армію, прымаў удзел у рэвалюцыйнай барацьбе.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі вярнуўся з арміі дадому і стаў адным з арганізатараў Савецкай улады ў роднай вёсцы. Праводзіў падзел панскай зямлі, арганізаваў камітэт беднаты.

Вясной 1918 г. Палессе акупіравалі нямецкія войскі. Іван Дзмітрыевіч звязаўся з мазырскім падполлем, пачаў выконваць яго заданні. Па даручэнні падпольнага цэнтра ён перайшоў лінію фронту, дабраўся да штаба Заходняга фронту, які знаходзіўся каля Рагачова, і прынёс туды звесткі аб становішчы ў глыбокім тыле. У штабе фронту Ганчару выдалі мандат на права арганіза-


І. Д. Ганчар


Ц. Б. Гнедзька


А. С. Мароз


П. С. Рухло

цыі партызанскага атрада, грошы і зброю, а таксама неабходныя інструкцыі. Партызанскі атрад сваімі дзеяннямі паскорыў вызваленне воласці ад ворага. У перыяд белапольскай акупацыі вясной 1920 г. І. Д. Ганчар зноў арганізаваў баявы атрад з мясцовага насельніцтва.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны Іван Дзмітрыевіч працаваў старшынёй сельсавета ў Скрыгалаве і Слабадзе, быў арганізатарам калгаса ў роднай вёсцы. Памёр у 1938 г.

**Гнедзька Цімох Барысавіч** нарадзіўся ў 1897 г. у беднай сялянскай сям'і. З малых год зведаў цяжар сялянскай працы. З 1914 г. працаваў на чыгунцы, затым ваяваў на франтах першай сусветнай вайны. Атруціўся газам, які немцы скарыстоўвалі пры вядзенні вайны, доўгі час лячыўся, вярнуўся ў родную вёску. У 1918 г. зноў на вайне з немцамі, цяпер ужо ў якасці байца Слабадскога партызанскага атрада. Выгналі немцаў, а праз год і новых захопнікаў — белапалякаў. Служба ў Чырвонай Арміі і выкананне адказных разведвальных заданняў за мяжой — у Польшчы. З 1924 па 1937 г. працаваў старшынёй Слабадскога сельсавета, старшынёй калгасаў у Хойніцкім і Калінкавіцкім раёнах.

У 1937 г. па беспадстаўным абвінавачанні ў шпіянажы на карысць буржуазнай Польшчы быў асуджаны на 10 год. Прасіўся з лагера на фронт, але не дазволілі. Вярнуўся з месцаў зняволення толькі пасля вайны. Між іншым, малодшы брат «ворага народа» Іван Барысавіч змагаўся ўсю Айчынную вайну палітруком роты, камандзірам атрада і партызанскай брыгады ў Мінскай вобласці, і яму дарэчы прыдаліся ўспаміны старэйшага брата пра дзейнасць партызан у грамадзянскую вайну.

У 1967 г. Цімох Барысавіч за актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Памёр у 1970 годзе.

**Мароз Аляксей Сцяпанавіч** нарадзіўся ў 1894 г. Усю першую сусветную вайну прайшоў на фронце разведчыкам. Вопыт франтавой разведкі спатрэбіўся А. С. Марозу ў гады грамадзянскай вайны ў Слабадскім партызанскім атрадзе І. Д. Ганчара, дзе ён быў камандзірам атрада разведчыкаў. Пасля выгнання белапалякаў служыў у Чырвонай Арміі, некалькі гадоў — на савецка-польскай мяжы, неаднаразова выконваў спецыяльныя заданні на тэрыторыі Польшчы. Працаваў таксама старшынёй калгаса ў Майсееўцы і старшынёй выканкама Прудкоўскага сельсавета.

У 1938 г. А. С. Мароз быў беспадстаўна рэпрэсіраваны. Асноўнае абвінавачанне: калі ў 20-я гады служыў на мяжы, быў «завярбованы» польскай разведкай. Рэабілітаваны пасля 1953 г. У 1967 г. узнагароджаны медалём «За адвагу». Памёр у 1981 г.

**Рухло Павел Сцяпанавіч** нарадзіўся ў 1900 г. у сям'і беднага селяніна. У 1918 г. стаў членам Слабадскога партызанскага атрада, мужна ваяваў супраць нямецкіх захопнікаў. Пасля заключэння Брэсцкага міру ваяваў у Чырвонай Арміі да канца грамадзянскай вайны, затым служыў на мяжы.

Вярнуўшыся з вайсковай службы, Павел Сцяпанавіч стаў актывістам і арганізатарам новага жыцця ў вёсцы. Доўгія гады быў членам сельскага Савета і членам праўлення калгаса. У 1941—1945 гг. ваяваў на фронце і партызанскім атрадзе. Пасля вайны працаваў у калгасе. Памёр у 1954 г.

Чатыры біяграфіі партызанаў Слабадскога атрада, а ўсіх больш за 50 жыхароў Слабады змагаліся тады ў тыле ворага. Невыпадкова, і праз дваццаць гадоў, у Вялікую Айчынную, з гэтай вёскі больш як 150 чалавек ваявалі ў партызанскіх атрадах і звыш 300 — на фронце. Гераічныя традыцыі мінулага захаваліся і памножыліся.

*М. Капач, М. Каян*

## З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДЗІРА 72-й БРЫГАДЫ 24-й СІБІРСКАЙ ЖАЛЕЗНАЙ ДЫВІЗІІ

№ 100/По г. Мозырь *29 чэрвеня 1920 г.*

Доношу, что после продолжительной перестрелки у дер. Раевской и при энергичной поддержке Днепровской флотилии, которая своим выходом к г. Мозырю наводила панику и беспорядки у противника, 29 июня... 215-м полком был взят г. Мозырь... По оставлении города противник зажег деревянный мост через р. Припять и взорвал железнодорожный мост, от которого уцелела одна ферма. В г. Мозыре оставлено противником: 300 артснарядов, 30 тыс. немецких патронов, одна кухня, 2 повозки, 5 винтовок и взято в плен 2 солдата. На видном месте противник оставил двух повешенных жителей...

Комбриг 72-й 24-й Железной *Устинов*
Заввоенкома *Лебединский*

*Борьба за Советскую власть в Белоруссии. Сборник документов. Мн., 1971. Т. 2. С. 335—336.*

## З ПРАТАКОЛА МЯЛЕШКАВІЦКАГА ВАЛРЭЎКАМА АБ ЗВЕРСТВАХ БЕЛАПАЛЯКАЎ У ВЁСЦЫ МЯЛЕШКАВІЧЫ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА

*6 ліпеня 1920 г.*

...В ночь с 26 на 27 июня с. г. в село Мелешковичи прибыл из Ельска 22-й пехотный польский полк. Остановившись, все солдаты приступили к повальному грабежу всего находящегося в квартирах обывателей имущества. Грабилось все: одежда, обувь и продукты. Входя в дом, бандиты-шляхтичи приставляли к груди обывателей винтовки и другого рода оружие, требуя деньги, причем избивали до потери сознания. Беспощадно насиловали женщин.

Грабеж и насилие продолжались с 11 часов вечера 26 июня до 10 часов вечера 27 июня с. г. Заграбив все имущество, сложив на подводы и отправив все за село, одна рота солдат осталась в селе и подожгла его в шести местах и начала обстреливать, дабы жители не могли спасти подожженных построек.

При этом одну семью бывшего советского служащего, секретаря Мелешковичского исполкома заперли в дом, наложив туда соломы, и подожгли снаружи здание и внутри, поставив у окон караул. Но благодаря тому, что в задней комнате здания окно выходило в глухой переулок, жертвам удалось незаметно бежать через таковой.

Было арестовано 16 человек, из коих один человек, отец сельского старосты Игнатий Жильский, 60 лет, расстрелян за то, что в селении не оказалось больше подвод увезти награбленное имущество, и 5 молодых людей, которые подозревались якобы партизанами. Все арестованные были подвергнуты телесному наказанию шомполами и резинами до 50 ударов, после истязания были приговорены к расстрелу и приставлены к стенке, но

расстрелян только упомянутый старик, а остальным было приказано разбежаться и по бежавшим было выпущено несколько залпов, и после чего оказался раненым один, а остальные спаслись благодаря огородам, находящимся вблизи.

Пожаром уничтожено 136 домов со всеми холодными постройками, скотскими и хлебными сараями. Человеческих жертв от огня — 3, которые болели тифом и не могли спастись.

Того же числа 41-м пехотным польским полком, проходившим через село Ремезы Мелешковичской волости, было зажжено в трех местах упомянутое село, где сгорело 36 домов со всеми холодными постройками... Грабилось не только то, что находилось в домах, но раздевали обывателей, оставляя босыми и нагими.

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 2. Л. 50—51.*



Зверствы польскіх акупантаў. 1920

## Палескі Жалязняк

Нарадзіўся А. А. Брэгман у 1895 г. у сям'і мазырскага рамесніка. Тут вучыўся, стаў на рэвалюцыйны шлях. А ў дваццаць два гады ён ужо член Бабруйскага камітэта РСДРП(б), член Бабруйскага Савета, камісар па харчаванні.

У час акупацыі Беларусі нямецкімі захопнікамі ў 1918 г. Аляксандр Абрамавіч знаходзіўся на падпольнай рабоце ў Барысаве і Магілёве. Пасля вызвалення Беларусі восенню 1918 г.— сакратар Магілёўскага павятовага камітэта РСДРП(б), член губернскага рэвалюцыйнага камітэта. Калі частку Беларусі захапілі польскія легіянеры, на Мазыршчыне надоўга спынілася лінія фронту. Для адпору ворагу была створана група войск, вядомая як Мазырская.

У лютым 1919 г. камісарам адной з брыгад групы быў прызначаны А. А. Брэгман. Чырвоная Армія вяла цяжкія баі з акупантамі. Камісар А. А. Брэгман пад псеўданімам Жалязняк вёў вялікую агітацыйную работу сярод чырвонаармейцаў і насельніцтва прыфрантавых вёсак у тыле ворага.

У адным з баёў летам 1919 г. камісар быў паранены і з групай чырвонаармейцаў захоплены ў палон.

Асабліва жорстка здзекаваліся палякі з А. А. Брэгмана. Білі шомпаламі, калі страчваў прытомнасць, аблівалі вадой. Потым па шыю закапалі ў зямлю, білі па галаве, пасыпалі раны соллю, пасля адсеклі галаву... Месца пахавання яго невядома.

*М. Капач*

## Яшчэ адна напасць — балахоўцы

Жыхароў Палесся і Мазыра чакала яшчэ адна напасць у тым жа дваццатым годзе. З Польшчы пачалося наступленне войск генерала Станіслава Булак-Балаховіча. У яго фарміраванне ўваходзілі тры пяхотныя і кавалерыйская дывізіі, атрады Барыса Савінкава і рускіх манархістаў. У іх было 36 гармат і 150 кулямётаў.

Захапіўшы 7 лістапада 1920 г. Петрыкаў, армія балахоўцаў рухалася дзвюма групамі на Калінкавічы і Мазыр. 10 лістапада паўднёвая група заняла Скрыгалаў, вёскі Раманаўка, Мялешкавічы, Слабада і ўварвалася ў Мазыр. У той жа дзень паўночная група захапіла Калінкавічы. Іх не маглі стрымаць маналікія сілы Чырвонай Арміі і мясцовых актывістаў. Забойствамі, разбоем і жорсткімі расправамі над мірнымі жыхарамі пазначаны шлях на Палессі бандытаў-балахоўцаў, крывавым было 10-дзённае гаспадаранне ў Мазыры «борцов за свободу».

Для таго каб ліквідаваць фарміраванне Булак-Балаховіча, камандаванне Чырвонай Арміі выдзеліла спецыяльную групоўку (4-ю, 10-ю, 17-ю, 48-ю стралковыя дывізіі), якая сканцэнтраванымі ўдарамі разграміла асноўныя сілы балахоўцаў на подступах да Мазыра з усходу. Сам Булак-Балаховіч з часткай войск стараўся ўтрымацца ў Мазыры. Яго аднадумцы, Савінкаў і брат генерала Юзэф Балаховіч, уцяклі з Мазыра, але на захадзе ад горада трапілі ў акружэнне. Разгарнуліся жорсткія баі, якія цягнуліся на працягу чатырох сутак.

18 лістапада 1920 г. 60 байцоў і разведчыкаў 145-га, 146-га і 147-га палкоў 49-й брыгады 17-й стралковай дывізіі пераправіліся на лодках цераз Прыпяць. У вёсцы Касцюковічы байцоў сустрэлі 7 перабежчыкаў-балахоўцаў. Яны далі каштоўныя звесткі аб праціўніку. Камандаванне даведалася, што ў Мазыры ўжо быў нацыянальны ўрад — Беларускі палітычны камітэт у складзе П. Алексіюка, В. Адамовіча, І. Міткевіча і іншых.

Раніцай 19 лістапада ўся 49-я брыгада пераправілася цераз Прыпяць, заняла Майсееўку і накіравалася да вёскі Прудок. Групоўка Б. Савінкава і Ю. Балаховіча, якая выступіла з Мазыра, аказалася адрэзанай. Яны адчайна рваліся на Петрыкаў — Тураў па дарозе праз Слабаду — Скрыгалаў — Балажэвічы. Вёскі некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Часці 49-й дывізіі мелі страты забітымі і паранеными.

Увесь дзень з ранку да вечара балахоўцы атакавалі Загорыны, Хамічкі, Майсееўку, Слабаду, Белую. Нарэшце балахоўцам цаной шматлікіх страт удалося ненадоўга захапіць Белую, Скрыгалаў і праз іх па бальшаку на Петрыкаў часткай войск з абозамі вырвацца з акружэння. З імі ўцёк і авантурыст Савінкаў. Ю. Балаховіч з групоўкай ноч на 20 лістапада правёў у Прудку і, упэўніўшыся, што шлях для адступлення яго групе па бальшаку на Скрыгалаў — Петрыкаў адрэзаны канчаткова, павярнуў на паўднёвы захад па дарозе на Малыя Зімовішчы — Мялешкавічы — Махнавічы — Буйнавічы — Злодзін — Тураў. Ноччу 21 лістапада ля вёскі Махнавічы адбыўся бой 146-га палка з балахоўцамі. Перарэзаць дарогу да адступлення ворагу батальёны 146-га палка не паспелі. Гэта скарыстаў Ю. Балаховіч. Цяжка паранены, ён здолеў з узводам асабістай аховы ўцячы ў напрамку Буйнавіч, звозячы з сабой найбольш каштоўнае дабро, нарабаванае ў Мазыры. Аднак 300 легіянераў былі ўзяты тут у палон.

Сам Булак-Балаховіч за братам і Савінкавым не пайшоў, з асноўнай часткай войска застаўся ў Мазыры, хацеў ператварыць горад у крэпасць. З Савінкавым у генерала былі розныя погляды на далейшае палітычнае ўпарадкаванне дзяржаўнай улады ў Расіі. Пад ударамі Чырвонай Арміі планы гэтых «вождей» як у Расіі, так і ў Беларусі праваліліся. Да Мазыра тым часам на ліквідацыю галоўнай групоўкі бала-

хоўцаў тэрмінова былі накіраваны 51-я брыгада 17-й стралковай дывізіі і іншыя часці.

Разгарнуліся баі за Мазыр. Чырвонаармейцы і чырвоныя камандзіры праяўлялі гераізм і мужнасць. Так, камандзір 6-й роты 151-га палка, ураджэнец Рагачоўшчыны М. В. Петракоў, прабраўшыся ў Мазыр, два дні з дапамогай падпольшчыкаў вёў разведку сіл балахоўцаў. А калі 151-шы полк пачаў бой за Мазыр, далучыўся да сваіх. За гэты подзвіг адважны камандзір быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Жорсткі бой разгарэўся 21 лістапада паміж 151-м стралковым палком і кавалерыйскім палком балахоўцаў за авалоданне Міхалкамі. Умелыя дзеянні чырвонаармейцаў не толькі забяспечылі вызваленне вёскі, але і прымусілі генерала пакінуць Мазыр.

Пацярпеўшы паражэнне пад Міхалкамі і пад пагрозай поўнага акружэння балахоўцы кінуліся з горада на паўночны ўсход, пераправіліся цераз Прыпяць, нечаканым ударам збілі невялікія атрады Чырвонай Арміі і, пакідаючы на шляху адступлення смерць і разруху, пайшлі на захад. У раёне Турава і Давыд-Гарадка польскія ўлады вымушаны былі раззброіць «армію» авантурыста.

Такім чынам за 16 сутак баёў войскі Булак-Балаховіча былі разгромлены. У палон было захоплена 4540 салдат, 120 афіцэраў, 4 гарматы, 40 кулямётаў, 7 аўтаматаў, 1286 вінтовак, сцяг, аўтамабіль і матацыкл.

Дзесяткі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, каштоўнымі падарункамі. Ардэнаносцамі сталі камандзір 49-й брыгады Касабуцкі Іван Сцяпанавіч, памочнік камандзіра 146-га палка Нарушэвіч Аляксандр Пятровіч, камандзір брыгады Віталь Дзмітрыевіч Каўшоў. Такой жа ўзнагароды быў удастоены вядомы латышскі бальшавік Аскар Юр'евіч Калнін, камандзір брыгады 48-й дывізіі, які загінуў ля вёскі Крышычы Калінкавіцкага раёна. У баях з балахоўцамі вызначыліся мазырскія камсамольцы В. Харужая, Г. Саф'ян, А. Ціханаў.

У данясенні Мазырскага рэўкама ад 4 снежня 1920 г. паведамлялася: «В связи с последним нашествием банд Балаховича город Мозырь был жестоко разграблен и разгромлен. Все имущество городского населения разграблено или уничтожено. Теперь город переживает как продовольственный, так и хозяйственно-экономический кризис». Мазырская павятовая камісія выявіла страты, якія былі нанесены белапалякамі і балахоўцамі. Было ўстаноўлена, што па Мазырскім павеце яны склалі 19 721 448 руб. 56 кап. (у залатой даваеннай валюце).

Савецкая дзяржава не пакінула народ у бядзе. Урад БССР выдзеліў фінансавыя сродкі для будаўніцтва жылля, аднаўлення бытавога абслугоўвання, пешаходнага і чыгуначнага мастоў цераз Прыпяць, арганізацыі дастаўкі прадуктаў. Мазыркі рэўкам пасля прад'яўлення справаздачы аб памерах прычыненых ворагамі матэрыяльных страт атрымаў 8 мільёнаў рублёў.

Мазыране і жыхары павета пачалі нарэшце аднаўляць мірнае жыццё, будаваць сваё будучае.

*І. Краўцоў*

## Цяжкія выпрабаванні

На прыкладзе адной толькі вёскі Махнавічы пераконваешся, колькі нягчасцяў і бедаў давялося перажыць вясковаму насельніцтву Мазыршчыны ў суровы паслярэвалюцыйны час. Небывалыя выпрабаванні ў гады грамадзянскай вайны выпалі на долю жыхароў гэтай вёскі.

У самым пачатку акупацыі Палесся германскімі войскамі жыхары Махнавіч і суседніх вёсак арганізавалі партызанскі атрад. Увесь 1919 г. і палову наступнага 1920 г. ішла вайна з пятлюраўцамі і белапольскімі захопнікамі. Махнавічы і другія вёскі на

Тураўскім бальшаку не раз станавіліся арэнаю баявых дзеянняў, пераходзілі з рук у рукі. Зноў, як і ў час барацьбы з кайзераўцамі, патрыёты Махнавіч і навакольных вёсак у складзе некалькіх партызанскіх атрадаў і груп ваявалі з захопнікамі. Групай партызан з Махнавіч камандаваў Машчыц Іларыён Нікіфаравіч. Архівы збераглі звесткі пра сумесныя баі Чырвонай Арміі і партызан у гэтых месцах. Так, 16 і 17 верасня 1919 г. у жорсткім баі белапалякамі былі захоплены Буйнавічы, Махнавічы і Мялешкавічы, але праз тры дні яны былі выгнаны з гэтых вёсак. 18 студзеня 1920 г. Махнавічы зноў былі захоплены ворагам. На гэты раз захопнікі пратрымаліся тут да 27 студзеня. Цяжкія баі пад Мазыром не сціхалі. Палякі імкнуліся захапіць горад — важны стратэгічны пункт. На мазырскім напрамку значна павялічылася колькасць войск і баявой тэхнікі праціўніка. Часці Чырвонай Арміі былі абяссілены бесперапыннымі баямі і сыпным тыфам, які лютаваў сярод насельніцтва і вайскоўцаў. 421-шы полк Чырвонай Арміі, штаб якога ў сярэдзіне лютага 1920 г. размяшчаўся ў Махнавічах, у баях 20 і 23 лютага панёс страты. 5 радавых было забіта, 4 — прапалі без вестак, некалькі дзесяткаў паранена.

Ранняя вясна і бездарожжа затрымлівалі папаўненне і абозы Чырвонай Арміі. Баі на подступах да Мазыра разгараліся ўсё больш. 5 сакавіка горад быў захоплены легіянерамі. Мазыршчына на некалькі месяцаў аказалася ў белапольскай акупацыі.

Не скарыліся захопнікам жыхары Палесся. Разгарэлася полымя партызанскай барацьбы, у якой удзельнічала больш за 50 жыхароў Махнавіч, Забалацця і іншых бліжэйшых вёсак. Канопліч Пётр Платонавіч, Канопліч Канстанцін Сцяпанавіч, Канопліч Захар, Фралоў Сцяпан загінулі ў баях з белапалякамі.

Вораг помсціў мясцоваму насельніцтву за падтрымку падпольнага і партызанскага руху. 26 чэрвеня была цалкам спалена суседняя вёска Мялешкавічы. Забітыя акупантамі былі амаль у кожнай вёсцы. А Чырвоная Армія ішла на дапамогу. 29 чэрвеня з баямі быў вызвалены Мазыр, праз некалькі дзён — Мялешкавічы і Махнавічы. Да 8 ліпеня ўся тэрыторыя раёна была вызвалена ад акупантаў.

Мірнае жыццё ў павеце і кожнай вёсцы стала наладжвацца. Аднавілі работу валасны рэвалюцыйны камітэт у Мялешкавіцкай воласці, куды адносіліся і Махнавічы. На месцах сталі працаваць сельскія Саветы. Махнавіцкі ўзначаліў Канопліч Іван Андрэевіч. Была адноўлена работа пачатковай школы, настаўнікам якой быў Дарашэвіч. Пачаўся падзел памешчыцкай зямлі.

А хутка новая бяда над Мазыршчынай — балахоўцы, якія выступілі з Польшчы. Тры пяхотныя і кавалерыйскую дывізіі, некалькі атрадаў манархістаў пры 36 гарматах і 150 кулямётах не змаглі затрымаць малалікія сілы Чырвонай Арміі. 9 лістапада былі захоплены Махнавічы, 10-га — Мялешкавічы, Скрыгалаў, Мазыр. Пачалося рабаўніцтва, расправы і здзекі з мірных жыхароў.

Камандаванне Чырвонай Арміі сканцэнтравала супраць балахоўцаў групоўку войск, якія 20 лістапада пасля жорсткіх чатырохсутачных баёў вызвалілі Мазыр. Ноччу 21 лістапада ля Махнавіч адбыўся бой 146-га палка Чырвонай Арміі з адступаючымі балахоўцамі. 300 легіянераў тут былі ўзяты ў палон.

*В. Бабкова, М. Капач*

### Легендарны камбрыг

У вёсцы Праўцюкі на адным з будынкаў устаноўлена мемарыяльная дошка. «Тут 11 лістапада 1920 г. загінуў камандзір брыгады Чырвонай Арміі Каўшоў Віталій Дзмітрыевіч». Са здымка 1919 г. глядзіць малады чалавек з энергічнымі рысамі твару. В. Д. Каўшову — 24. А праз год ён загінуў.



В. Д. Каўшоў

Віталій Каўшоў з юнацкіх гадоў звязаў свой лёс з рэвалюцыйным рухам. Адразу ж пасля Лютаўскай рэвалюцыі ўступіў у бальшавіцкую партыю. У Златаусце В. Д. Каўшоў, выбраны старшынёй рэвалюцыйнага камітэта, праводзіў вялікую арганізатарскую работу па станаўленні Савецкай улады на Урале. Калі чэхі ўзнялі мяцеж, Віталій Каўшоў сфарміраваў конную дружыну, якая ўступіла ў няроўны бой з іх корпусам. Кавалерысты два месяцы дзейнічалі па тылах праціўніка, затым злучыліся з Чырвонай Арміяй.

Таленавітыя, адданыя Радзіме камандзіры патрэбны былі Чырвонай Арміі, і камандаванне пасылае Віталія Каўшова ў толькі што адкрытую вышэйшую ваенную навучальную ўстанову — Акадэмію Генеральнага штаба.

З курсантаў маскоўскіх ваенных навучальных устаноў восенню 1919 г. тэрмінова была сфарміравана 3-я Маскоўская стралковая брыгада, яе накіроўвалі на абарону Петраграда ад войск Юдзеніча, і камісарам брыгады быў прызначаны В. Д. Каўшоў. За доблесць і мужнасць Віталій Дзмітрыевіч быў узнагароджаны імянной зброяй.

Вясной 1920 г. на Савецкую краіну рушылі польскія войскі. Віталій Дзмітрыевіч зноў на фронце — памочнік начальніка аператыўнага аддзела штаба 8-й стралковай дывізіі 16-й арміі, затым начальнік штаба 2-й кавалерыйскай брыгады 13-й дывізіі. Неўзабаве ён прызначаецца камандзірам 28-й брыгады. Нялёгкія баі давялося весці брыгадзе Каўшова.

У кастрычніку 1920 г. быў падпісаны дагавор аб перамір'і, папярэдніх умовах міру з Польшчай і ўстаноўлена дзяржаўная граніца. Але ў лістападзе ў Беларусь уварваліся шматлікія, добра ўзброеныя войскі Булак-Балаховіча. Яны захапілі многія раёны Палесся, у тым ліку і Мазыр. На падмогу мясцовай міліцыі і атрадам, якія былі сфарміраваны з камуністаў і камсамольцаў, прыйшлі рэгулярныя часці Чырвонай Арміі. З маршу прыняла баявы парадак і 28-я брыгада. Завязаліся жорсткія баі.

Стомленыя коннікі брыгады Каўшова 11 лістапада размясціліся на адпачынак у Праўцюках. Мясцовым кулакам-хутаранам удалося ноччу правесці ў вёску атрад балахоўцаў. Дом, дзе знаходзіўся Каўшоў і іншыя камандзіры, быў акружаны. Каўшоў адстрэльваўся, пакуль варожая куля не абарвала яго неспакойнае, гераічнае жыццё.

В. Д. Каўшоў быў пахаваны на могілках у Праўцюках. Потым яго прах перавезлі ў Маскву і перазахавалі там на Краснай плошчы.

5 лютага 1921 г. загадам Рэўваенсавета В. Д. Каўшоў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

*М. Капач*

## «АРМИЯ» БУЛАК-БАЛАХОВИЧА В МОЗЫРЕ

...Отряд, растянувшись на добрые две версты, приближался к Мозырю. Вернулись высланные вперед разведчики, они доложили, что в городе, кроме десятка комсомольцев-чоновцев, нет никого. А город богатый. Эта новость, сопровождаемая ликующими криками, как вихрь пронеслась по колонне.

Бой за Мозырь начался в сумерках, и не понять было — действительно ли шел бой на самом деле, или просто так, на скаку стреляя во все стороны, передовой эскадрон ворвался

в город, и тотчас взметнулись над городом несколько пожаров. Когда Савинков и старший Балахович въехали на центральную площадь города, младший Балахович уже творил там суд и расправу — на балконе здания почты уже были повешены двое, а третьего вешали на фонаре. Иосиф Балахович подскакал к брату на разгоряченном коне:

— Стась! Красных гадов вешаем! Хошь сам побаловаться?

— Успеется,— отмахнулся старший и спросил, где его квартира.

Иосиф показал плетью на здание почты, где качались повешенные, и крикнул:

— Вон там, с украшением!

Балахович и Савинков расположились на втором этаже. Здесь, очевидно, жил заведующий почтой — это была большая, давно и хорошо обжитая квартира. Куда только подевались ее обитатели?

Савинков занял маленькую комнатку рядом с кухней, заперся и, не раздеваясь, повалился в постель. Потом он много раз просыпался от пьяного ора, всю ночь играла гармошка, визжали женщины, раздавались выстрелы — братья Балаховичи справляли победу.

...Однако выехать в этот день Савинков не мог. Вскоре после полудня балаховцы вынуждены были вступить в бой с частью Красной Армии, прибывшей в Мозырь из Гомеля. Бой завязался на восточной окраине города, и до вечера нельзя было понять, выдержат ли балаховцы натиск красных. Уезжать в этой обстановке Савинков считал неприличным. Поздно вечером стало известно, что к Мозырю движется еще одна красноармейская часть, и тогда Балахович принял решение временно выйти из города...

*З кнігі: Василий Ардаматский. «Возмездие».*

## ЗАГАД № 1 МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА

*21 лістапада 1920 г.*

**О возобновлении деятельности комитета после разгрома банд Булак-Балаховича**

1. Сего числа военно-революционный комитет в старом составе вернулся в г. Мозырь и приступил к исполнению своих обязанностей.
2. Доводится до сведения граждан г. Мозыря и уезда, что банда Булак-Балаховича разбита. Рассеянные по уезду незначительные отряды бандитов не представляют никакой опасности, и приняты меры по их поимке.

   Граждане г. Мозыря и уезда призываются к полнейшему спокойствию, не придавать значения провокационным слухам, распространяемым провокаторами и агентами бандитов, при обнаружении таковых задерживать и препровождать в военревком, который с ними поступит по закону военно-революционного времени.
3. Всем жителям, коим известно местопребывание солдат балаховской банды, немедленно сообщать в увоенревком. Укрыватели остатков банд понесут самое строгое наказание вплоть до расстрела...

Предвоенревкома *В. Кожуро*
Члены военревкома *Барсуков, Краснов, Бежик*

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Л. 263.*

## ДАНЯСЕННЕ МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕНРЭЎКАМА Ў РЭЎАРМ 16 І РЭЎКАМБЕЛ АБ ВЫЗВАЛЕННІ МАЗЫРСКАГА ПАВЕТА АД БАНД БУЛАК-БАЛАХОВІЧА І ЎСТАНАЎЛЕННІ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў МАЗЫРЫ І ПАВЕЦЕ

*26 лістапада 1920 г.*

Доношу, что Мозырский уезд почти весь очищен от балаховской банды, а ее отдельные части, рассеявшиеся по уезду незначительными кучками, энергично вылавливаются.

В освобожденных волостях уезда, а именно: Михалковской, Мелешковичской, Слободской, Скрыгаловской — уже организованы волвоенревкомы, но для назначения на ответственные должности в уезде ощущается недостаток в опытных политических работниках, об откомандировании коих убедительно прошу.

Для расследования и выяснения жертв балаховских банд по гор. Мозырю и уезду образована особая комиссия из пяти человек, которая уже приступила к своим обязанностям.

Отделы ревкома постепенно возвращаются в Мозырь, вместе с своими сотрудниками приступают к организационной работе.

Связь с волвоенревкомами уезда налаживается.

В заключение, прошу необходимую материальную поддержку.

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 5. Л. 8.*

### ДАНЯСЕННЕ МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕНРЭЎКАМА Ў РЭЎКАМ БЕЛАРУСІ АБ РАЗГРОМЕ МАЗЫРА БАНДАМІ БУЛАК-БАЛАХОВІЧА І АБ НЕАБХОДНАСЦІ АКАЗАННЯ ДАПАМОГІ НАСЕЛЬНІЦТВУ МАЗЫРА І ПАВЕТА

*4 снежня 1920 г.*

В связи с нашествием банд Балаховича город Мозырь подвергся небывалому разгрому. Все имущество городского населения разгромлено и разбито… Город переживает как в продовольственном, так и в хозяйственно-экономическом отношении небывалый кризис.

Излишне упоминать, что местные органы не располагают никакими ресурсами, а потому необходима немедленная помощь центра. Крестьянское население уезда за весь период не получило никаких фабрикатов, в то время как, находясь в фронтовой полосе, переносило все тяжести гражданской войны. В настоящее время опродкомдив 17 выполняет разверстку по уезду. В связи с этим Мозырский увоенревком просит Ревком Белоруссии об энергичном воздействии на соответствующие органы, как-то: компродбел, губсоюз, совнархоз об отпуске в самом срочном порядке для Мозырского уезда всевозможных фабрикатов и предметов широкого потребления. В случае неимения потребного количества фабрикатов в Минске увоенревком просит выдать члену коллегии Мозырского райпродкома тов. Розенману мандат на право получения этих предметов непосредственно из Москвы в счет компродбела.

Предувоенревкома
Секретарь

*Філ. ДА Гом. вобл. г. Мазыр. Ф. 307. Воп. 1. Спр. 5. Л. 22.*

### З ПАВЕДАМЛЕННЯ АБ РАБОЦЕ КАМІСАРЫЯТА САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ РЭЎКАМА БССР ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ НАСЕЛЬНІЦТВУ, ШТО ПЕРАЖЫЛО АКУПАЦЫЮ

*12 снежня 1920 г.*

Работа по оказанию помощи крестьянству и жертвам контрреволюции идет быстрыми темпами. Полученные ранее из Смоленска и Рославля 3 вагона мануфактуры распределяются среди бедноты и красноармейцев.

Между уездами мануфактура распределена следующим образом:

Мозырский уезд — 20 000 аршин.

*«Советская Белоруссия», 12 снежня 1920 г.*

## Ваяваў і працаваў на Прыпяці

Каралёў Пётр Яўхімавіч — патомны прыпяцкі рачнік, жыхар пасёлка Пхоў (цяпер мікрараён Мазыра), актыўны ўдзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў.

Нарадзіўся ў 1890 г. у Маскоўскай губерні. У час рэвалюцыйных падзей 1905 г. удзельнічаў у забастоўках маскоўскіх рабочых, выконваў заданні старэйшых. У 1912 г. быў прызваны на флот і пасля пачатковай падрыхтоўкі ў балтыйскім флоцкім экіпажы служыў камендорам на Амурскай ваеннай флатыліі. У 1916 г. яго за бунтарскі характар адлічылі з флатыліі і накіравалі на Заходні фронт.

Ваяваў кулямётчыкам і разведчыкам каля Маладзечна. Там жа сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю, быў абраны франтавікамі членам палкавога камітэта. У 1917 г. як былы марак і рачнік быў накіраваны служыць на бранякатэры Прыпяцкага атрада рачных суднаў За-

ходняга фронту, галоўнай базай якога былі Мазыр і Пхоў.

У гэтым атрадзе служыла нямала маракоў-балтыйцаў, накіраваных сюды з флоту за рэвалюцыйную дзейнасць, з якімі П. Я. Каралёў удзельнічаў у стварэнні органаў Савецкай улады на Мазыршчыне ў кастрычніку 1917 года.

Першую палову 1918 г. П. Я. Каралёў у Маскве, бо Беларусь была захоплена нямецкімі войскамі. Восенню таго ж года ён зноў накіроўваецца ў Гомель і Кіеў, дзе фарміравалася Днепроўская ваенная флатылія. Пётр Яўхімавіч назначаецца старшым камендорам (камандзірам гарматы) кананерскай лодкі «Малый». Пачаліся ўпартыя баі з дзянікінцамі, пятлюраўцамі, рознымі бандыцкімі фарміраваннямі на Дняпры і яго прытоках, а потым і з белапалякамі, якія рваліся на ўсход.

Значнай баявой аперацыяй з удзелам канлодкі «Малый», іншых суднаў флатыліі быў вядомы ў гісторыі грамадзянскай вайны Лоеўскі прарыў, калі ноччу з 1 на 2 чэрвеня 1920 г. у жорсткім баі караблі флатыліі прарваліся каля Лоева ўверх па Дняпры і Прыпяці. Зберaглося баявое данясенне камандзіра канлодкі «Малый» А. П. Эрдмана і паліткама Саднікава, у якім аб Каралёве і яго сябрах па зброі напісана:

«...Доношу, что во время боев по прорыву обороны белополяков каждый моряк исполнял приказания точно и скоро, несмотря на неприятельский артиллерийский и пулеметный огонь. Общим желанием и старанием команды добить врага канлодка «Малый» прорвалась через неприятельские укрепления, нанеся удар ему. Боевой приказ от 1 июня за № 31 исполнен полностью...» (РДАВМФ. Ф. р.-139. Воп. 1. С. 349. Л. 111.)

Кананерская лодка «Малый» за баі ў час Лоеўскага прарыву была ўзнагароджана Ганаровым Чырвоным сцягам. У гэтыя дні П. Я. Каралёў быў паранены. Потым у якасці старшага камендора канлодкі «Губительный» вызваляў ад белапалякаў Мазыр, Петрыкаў, Тураў, іншыя прырэчныя гарады Беларусі.

У сакавіку 1921 г. Пётр Яўхімавіч дэмабілізаваўся з флатыліі і ўсё далейшае жыццё звязаў з Дняпром і Прыпяццю, з 1946 г. жыў і працаваў у рачным порце «Пхоў».

*І. Краўцоў*

## За свабоду Беларусі

На тэрыторыі Мазыршчыны пасля грамадзянскай вайны засталося некалькі брацкіх і адзіночных магіл. У іх пахаваны воіны Чырвонай Арміі, партызаны і падпольшчыкі, якія аддалі сваё жыццё за ўладу Саветаў, мірныя жыхары — ахвяры захопнікаў. Захаваліся імёны некаторых з іх.

**ГОРАД МАЗЫР**
**КАЛЯ СТАДЫЁНА «СПАРТАК»**

**АЛЕЙНІКАЎ Іван Емяльянавіч,** н. у 1880 у Чарнігаўскай губ., камандзір вартавога карабля «Беркут», загінуў 10.10.1920.

**ГАВЯДЗІНАЎ Васіль Іванавіч,** н. у 1895 у Яраслаўскай губ.,

**ГАНЧАРЭНКА Яўхім Сяргеевіч,** н. у 1896 у Чарнігаўскай губ.— камендоры кананерскай лодкі «Мощный» Дняпроўскай ваеннай флатыліі — загінулі 10.7.1920.

**ДАНІЛЕЎСКІ Мікалай Сцяпанавіч,** н. у 1892, сакратар ЦВК Украіны ў 1918, камісар 139-й брыгады 47-й стралковай дывізіі, загінуў 5.3.1920.

**КАНАВАЛАЎ Рыгор Савельевіч,** н. у 1897 у Бранскай губ., старшы камендор канлодкі «Мощный», загінуў 10.7.1920.

**КАЦМАН Хая,** падпольшчыца г. Калінкавічы, павешана белапалякамі ў чэрвені 1920.

**КІРПІЧНІКАЎ Ш.,** рабочы фабрыкі «Ма-



І. Е. Алейнікаў




Помнік загінуўшым у грамадзянскай вайне

ланка», падпольшчык г. Мазыр, павешаны белапалякамі ў чэрвені 1920.

**МУРАЧОЎ Мікалай,** камендор вартавога карабля «Ястреб», утапіўся пры размініраванні чыгуначнага моста 11.7.1920.

**РУДЗІТ Юлій Янавіч,** н. у 1890 у Віцебскай губ., сігнальшчык канлодкі «Мощный», загінуў 10.7.1920.

**САЛАЎЁЎ Рыгор,** палітработнік Чырвонай Арміі, падпольшчык г. Калінкавічы, павешаны белапалякамі ў чэрвені 1920.

**ЯЎСЕЕНКА Андрэй Іванавіч,** н. у 1896 у Бранскай губ., камендор канлодкі «Мощный», загінуў 10.7.1920.

25 воінаў Чырвонай Арміі і ўдзельнікаў падпольнага руху на Мазыршчыне. (Прозвішчы і імёны не ўстаноўлены.)

## КАЛЯ КУРГАНА СЛАВЫ

**ЧАРНЕЦКІ Васіль,** ураджэнец Хмяльніцкай вобл., машыніст браняпоезда, загінуў у 1920.

## ВЁСКА ПРАЎЦЮКІ (МОГІЛКІ)

Два чырвонаармейцы загінулі 11.11.1920.

## ВЁСКА СЛАБАДА (МОГІЛКІ)

**АЛЯКСАНДРАЎ Андрэй,** шкіпер кананерскай лодкі «Грозящий» Дняпроўскай ваеннай флатыліі,

**БАРТ Іаган Генрыхавіч,** н. у г. Талін, машыніст міннага дывізіёна флатыліі — загінулі 1—5.3.1920.

**БЕРКУМ-ВАСІЛЬЕЎ Георгій,** камандзір атрада маракоў флатыліі, загінуў 20.12.1919.

**ДЗМІТРЫЕЎ Іван Дзмітрыевіч,** н. у 1889 у Чувашыі, рулявы канлодкі «Молодецкий»,

**ЖЫТНІКАЎ Ануфрый Паўлавіч,** н. у 1882 у в. Н. Івакі Добрушскага р-на, сігнальшчык канлодкі «Молодецкий» — загінулі 5.3.1920.

**ЗАТЫКАЙЧАНКА Іван,** н. у Іванаўскай губ., кулямётчык канлодкі «Молодецкий»,

**КАВАЛЁЎ Ілья Фёдаравіч,** н. у Курскай губ., камендор канлодкі «Грозящий»,

**КАРАЛЁЎ Захар Логвінавіч,** н. у 1884 у Арлоўскай губ., мінёр флатыліі — загінулі ў 1920.

**КАРЖАВІН Іван Сцяпанавіч,** н. у Вяцкай губ., загадчык гаспадаркі канлодкі «Мудрый», загінуў 1.3.1920.

**МЯРЭЖКА,** матрос флатыліі, загінуў 20.12.1919.

**РЫБІН Іван Паўлавіч,** н. у Томскай губ., матрос тральшчыка «Міна»,

**САВІЧ Мікалай Ільіч,** н. у 1893 у Тульскай губ., матрос флатыліі,

**ЦІМАФЕЕЎ Якаў Сяргеевіч,** н. у Казанскай губ., начальнік каманды штаба флатыліі — загінулі ў 1920.

Страты 417-га палка ў баях на Мазыршчыне ў лютым 1920 г.

а) Загінулі ў баі каля в. Лешня 19.2.1920 (месца пахавання невядома):

**КАЎГАН Піліп,** чырвонаармеец 6-й роты

**МАСЛАЎ Усцін,** чырвонаармеец 6-й роты

**ПЯТРОЎ Аляксей,** памочнік камандзіра 6-й роты

**УДАЛЬЦАЎ Аляксандр,** чырвонаармеец 6-й роты

**ЦЫГАНОЎ Рыгор,** камандзір узвода 6-й роты

**ЮШКОЎ Рыгор,** камандзір узвода 1-й роты.

б) Прапалі без вестак у баі каля в. Лешня 19.2.1920:

**ДАНЦОЎ Нікіфар,** чырвонаармеец 1-й роты

**ДРАБЫШЭЎСКІ Фёдар,** камандзір аддзялення 1-й роты

**КАРПЕНЕР Саламон,** камандзір узвода 1-й роты

**КОЛАСАЎ Васіль,** камандзір аддзялення 1-й роты

**ШЛІПАЎ Міхаіл,** чырвонаармеец 6-й роты

**ПЯТРОЎ Міхаіл,** чырвонаармеец 1-й роты

**ПЯТРУНІН Сцяпан,** камандзір аддзялення 1-й роты



А. П. Жытнікаў



І. С. Каржавін

**СУРКОЎ Васіль,** чырвонаармеец 1-й роты.

в) Прапалі без вестак у баі каля в. Скрыгалаў 22.2.1920:

**ІВАНОЎ Пётр,** чырвонаармеец 4-й роты
**ІВАНОЎ Сцяпан,** чырвонаармеец 4-й роты
**КАСЦЯЕЎ Сяргей,** камандзір узвода 4-й роты
**ЛЕВЯШЧОЎ Павел,** чырвонаармеец 4-й роты
**СМІРНОЎ Мікалай,** чырвонаармеец 4-й роты, прапаў без вестак каля в. Слабада 23.2.1920.

*РДВА. Ф. 36 835. Воп. 1. Спр. 6. Л. 47.*

Загінулі 20 і 23 лютага 1920 г. у баях за вёскі Махнавічы, Рэмязы, Мялешкавічы чырвонаармейцы 421-га палка (месца пахавання невядома):

**ГАРВОН Сямён,**
**ЛАДЫШ Мікіта,**
**МУЛЫГІН Мікалай,**
**САМАНЧУК Рыгор** — разведчыкі палка.
**ПЕТЫШКОЎ Андрэй** — радавы 4-й роты.

Прапалі без вестак у тыя ж дні чырвонаармейцы 4-й роты:

**БАНЬКОЎСКІ Кузьма**
**ДАВЕРАЎ Іван**
**ЛАЎРЫК Сямён**
**МЕЛЬНІКАЎ Антон.**

*РДВА. Ф. 3787. Воп. 1. Спр. 9. Л. 202, 203, 210.*

Спіс воінаў 1-га Мазырскага берагавога атрада, якія прапалі без вестак у баях з белапалякамі 4—5 сакавіка 1920 г. у раёне вёсак Слабада, Майсееўка, Касцюковічы:

**БАЗАРАЎ Іван Мітрафанавіч**
**БУРДЗІН Міхаіл Мацвеевіч**
**ВАСЬКОЎ Іван**
**ДАЗОРАЎ Іван Міхайлавіч**
**ЖАБІН Іван Васілевіч**
**ІВАНОЎ Іван**
**КАРАТКЕВІЧ Рыгор Фролавіч**
**КОСЦЕРАЎ Васілій Міхайлавіч**
**КУРЫН Аляксей Сцяпанавіч**
**КУЦЫ Іван Канстанцінавіч**
**ЛУК'ЯНЧАНКА Іван Іосіфавіч**
**МАЛЫХІН Мітрафан**
**РУТКЕВІЧ Уладзіслаў Уладзіслававіч**
**РЫЛЬЦАЎ Апанас Іванавіч**
**САВЕНКА Іван**
**СМІРНОЎ Апанас Іванавіч.**

*РДВА. Ф. 3787. Воп. 1. Спр. 19. Л. 105.*

## Ваеннаслужачыя і мірныя жыхары Мазыршчыны, якія загінулі ў гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў (1914—1920)

### ГОРАД МАЗЫР

**АРКІН Арон Сімхавіч,** палітрук роты, загінуў у 1920 каля г. Полацк.
**БОБР Дзмітрый,** павешаны белапалякамі ў 1920.
**БРЭГМАН Аляксандр Абрамавіч,** н. у 1895, камісар брыгады Мазырскай групы Чырвонай Арміі, закатаваны белапалякамі летам 1920.
**БРЭГМАН Лейба Саламонавіч,** чырвонаармеец, загінуў 3.7.1919 у Валожынскім р-не Мінскай вобл.
**БЯРНАЦКІ,** загінуў у 1920.
**ЗЕЛЬДЗІН Навум Беркавіч,** чырвонаармеец, загінуў 3.7.1919 у Валожынскім р-не Мінскай вобл.
**ЛОБАЧ Майсей Міхайлавіч,** чырвонаармеец, загінуў 2.5.1920.
**ПАЛЕЙ,** загінуў у 1920.
**ФІШБЕЙН Самуіл Арэф'евіч,** прапаў без вестак у 1919.
**ШУСТЭРМАН Барыс,** камандзір партызанскага атрада, загінуў у чэрвені 1920.
**ШЭЙКМАН,** загінуў у 1920.
**ШЭЙНМАН Самуіл Зельманавіч,** чырвонаармеец, павешаны ў 1919 дзянікінцамі ў г. Харкаў.
**ШЭЙНМАН Самуіл Ісакавіч,** чырвонаармеец, загінуў у 1919 каля г. Віцебск.

## КАМЕНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА МЛЫНОК

**КАДОЛ Ілья Дзям'янавіч,** загінуў у 1917 каля г. Баранавічы.